

СОВРЕМЕННЫЕ ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ ТЕХНОЛОГИИ ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

В. М. АНЦЫПІРОВІЧ

# ФАРМІРАВАННЕ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ДАШКОЛЬНІКАЎ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

Современные педагогические технологии
дошкольного образования

В. М. Анцыпіровіч

# ФАРМІРАВАННЕ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ДАШКОЛЬНІКАЎ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

Пад рэдакцыяй Н. С. Старжынскай

Дапаможнік для педагогаў устаноў,
якія забяспечваюць атрыманне
дашкольнай адукацыі

Мінск "Зорны верасень" 2007

УДК 373.2.016
ББК 74.100
А 74

*Серыя заснавана ў 2007 годзе*

Р э ц э н з е н т ы:
кандыдат педагагічных навук, дацэнт *А. М. Катко*;
музычныя кіраўнікі *А. М. Князь* і *Ю. Ф. Еўсцягнеева*

**Анцыпіровіч, В. М.**

А 74 Фарміраванне музычнай культуры дашкольнікаў сродкамі беларускага фальклору: дапаможнік для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / В. М. Анцыпіровіч; пад рэд. Н. С. Старжынскай. – Мінск : Зорны верасень, 2007. – 60 с. – (Современные педагогические технологии дошкольного образования).

ISBN 978-985-6775-67-6.

Серыя "Современные педагогические технологии дошкольного образования" уключае новыя педагагічныя тэхналогіі ў розных аспектах развіцця дзіцяці: маўленчага і лінгвістычнага, мастацка-маўленчага, музычна-эстэтычнай культуры сродкамі беларускага музычнага фальклору, музычнага, экалагічнага з выкарыстаннем прыродных матэрыялаў і інш.

Змяшчае тэарэтычны і практычны матэрыял, які раскрывае асноўныя аспекты педагагічнай тэхналогіі па фарміраванні музычнай культуры дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту сродкамі беларускага фальклору.

Адрасуецца педагогам устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі.

**УДК 373.2.016**
**ББК 74.100**

**ISBN 978-985-6775-67-6**

© Анцыпіровіч В. М., 2007
© Афармленне. ПУП "Зорны верасень", 2007

# УВОДЗІНЫ

Сёння ў педагагічнай навуцы пытанні фарміравання культуры асобы становяцца надзвычай актуальнымі, што звязана з сучаснымі патрабаваннямі грамадства да кожнага свайго прадстаўніка. Значнай часткай культуры грамадства, якая павінна засвойвацца ўжо ў дзяцінстве, з'яўляецца традыцыйная, фальклорная культура, якая ўключае ў сябе і культуру музычную.

Значнасць выкарыстання фальклорнага рэпертуару у музычным выхаванні дзяцей ужо на першых узроўнях адукацыі не выклікае сумненняў і знаходзіць сваё падцвярджэнне як у гісторыі музычна-педагагічнай думкі, так і ў сучасных працах, у якіх ідзе размова аб выхаванні дзяцей сродкамі нацыянальнай культуры.

Так, фальклорны рэпертуар ляжаў у аснове найвядомейшых сістэм музычнага выхавання XX стагоддзя, распрацаваных Карлам Орфам і Золтанам Кодаям. З апорай на беларускі песенны фальклор прапанаваў ажыццяўляць музычнае выхаванне дашкольнікаў і малодшых школьнікаў айчынны педагог А. Грыневіч, аб чым сведчыць матэрыял его «спеўнікаў», выдадзеных у 20-я гады XX стагоддзя. Цікаўнасцю да пошуку шляхоў выкарыстання фальклорнага матэрыялу адрозніваюцца працы сучасных расійскіх даследчыкаў (С. С. Балашовай, Л. І. Баравікова, Г. Г. Ібрагімава, А. А. Карожкінай, Г. І. Калеснікавай, Г. М. Навуменка, З. М. Яўгільдзінай і інш.). Значная ўвага надаецца фальклорнаму рэпертуару і ў нацыянальнай праграме выхавання і адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту «Пралеска».

Калі айчынная фалькларыстыка прапануе багаты літаратурны і натаваны музычны матэрыял, фоназапісы, тэарэтыка-гістарычны і музыкаведчы аналіз з'яў нацыянальнага музычнага фальклору, то ў айчыннай педагагічнай навуцы не існуе спецыяльных даследванняў, прысвечаных праблеме выкарыстання нацыянальнага музычнага фальклору ў працы з дашкольнікамі. У практыцы дашкольных установ далучэнне дзяцей да музычнага фальклору часцей адбываецца падчас падрыхтоўкі і правядзення фальклорных святаў, што значна збядняе

вопыт зносін дашкольніка з багатым і педагагічна каштоўным матэрыялам, якім з'яўляецца музычны фальклор. У выпадку азнаямлення з фальклорнымі творамі падчас музычных заняткаў часцей за ўсё мае месца несістэматызаванае выкарыстанне асобных твораў, падпарадкаванае задачам асобнага віду музычнай дзейнасці дзяцей – спеваў, музычна-рытмічных рухаў або музіцыравання. Пры гэтым у працэсе адбору гэтых твораў не заўсёды акцэнтуецца ўвага на інтанацыйнай самабытнасці ўзораў, падсвядомае асэнсаванне і засваенне якой у практычнай дзейнасці дашкольнікамі з'яўляецца значным этапам у пазнанні імі асаблівасцей нацыянальнай музычнай мовы.

Актуальнасць дадзенай праблематыкі і ў той жа час нераспрацаванасць як тэарэтычных, так і метадычных аспектаў далучэння дашкольнікаў да музычнага фальклору дыктуе неабходнасць стварэння адпаведнай тэхналогіі. Пры гэтым універсальнасць гэтага пласта музычнай культуры, яго шырокія выхаваўчыя і развіццёвыя магчымасці дазваляюць ставіць дастаткова маштабную мэту – фарміраванне асноў музычна-эстэтычнай культуры асобы.

Прапанаваная тэхналогія не прэтэндуе на вычарпальную паўнату і бясспрэчнасць, але з'яўляецца адным з крокаў на шляху пашырэння ўжывання ўзораў нацыянальнай культуры ўжо на першай ступені адукацыі, больш поўнага і эфектыўнага выкарыстання ўсіх развіццёвых і выхаваўчых магчымасцей музычнага фальклору.

# АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ ТЭХНАЛОГІІ

*Музычна-эстэтычная культура асобы* – інтаграваная якасць, якая трактуецца як мера засваення асобай музычнай культуры грамадства і праяўляецца праз уласцівы пэўнаму ўзросту узровень развіцця музычна-эстэтычнай свядомасці, музычных і творчых здольнасцей і ўзровень авалодвання музычнай дзейнасцю.

*Музычны фальклор* – сукупнасць песеннай, танцавальнай і інструментальнай творчасці народа.

# СТРУКТУРА І ЗМЕСТ БЛОКАЎ ТЭХНАЛОГІІ

*Педагагічны блок* – прыводзяцца класіфікацыйныя параметры тэхналогіі, спектр яе мэтавых арыентацый, раскрываюцца асноўныя канцэптуальныя палажэнні, характарызуюцца асноўныя педагагічныя сродкі тэхналогіі.

*Дыягнастычны блок* – раскрываецца сутнасць кампанентаў музычна-эстэтычнай культуры старэйшых дашкольнікаў і асаблівасці іх дыягностыкі з улікам спецыфікі выкарыстання ў дыягнастычных заданнях музычнага фальклору.

*Метадычны блок* – прадстаўлена канцэптуальная мадэль фарміравання музычна-эстэтычнай культуры дашкольнікаў сродкамі музычнага фальклору і сістэма арганізацыі работы па далучэнні дашкольнікаў да беларускага музычнага фальклору.

*Выніковы блок* – акрэслены вынікі распрацаванай тэхналогіі і яе магчымая значнасць у сістэме сучаснага музычнага выхавання дашкольнікаў, падагульнены яе спецыфічныя рысы.

# КЛАСІФІКАЦЫЙНЫЯ ПАРАМЕТРЫ ТЭХНАЛОГІІ*

*Па ўзроўні прымянення*: прыватнаметадычная (прадметная).

*Па філасофскай аснове*: гуманістычная + культуралагічная.

*Па асноўным фактары развіцця*: сацыягенная+псіхагенная.

*Па канцэпцыі засваення*: развіццёвая + сугестыўная.

*Па арыентацыі на асабовыя структуры*: ВУН + СРД + эўрыстычная.

*Па характары зместу*: навучальна-выхаваўчая, свецкая, гуманістычная, рэгіянальна-накіраваная.

*Па тыпе кіравання*: сістэма малых груп.

*Па арганізацыйных формах*: групавая + індывідуальная.

*Па пераважаючым метадзе*: гульнявая, развіццёвая, творчая.

*Па накірунку мадэрнізацыі*: на аснове актывізацыі і інтэнсіфікацыі дзейнасці дашкольнікаў.

*Па катэгорыі навучэнцаў*: масавая.

---

*Паводле *Г. К. Селейкі.*

# МЭТА І СПЕКТР МЭТАВЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ ТЭХНАЛОГІІ

*Мэта тэхналогіі* – фарміраванне ў старэйшых дашкольнікаў кампанентаў музычна-эстэтычнай культуры; садзейнічанне далучэнню дашкольнікаў да нацыянальнай культуры праз засваенне ўзораў музычнага фальклору і фарміраванне на аснове фальклорнага рэпертуару музычна-эстэтычнай культуры дзіцяці.

*Дыдактычныя*: назапашванне "слоўніка" нацыянальна-характэрных музычных інтанацый; засваенне моўных асаблівасцей беларускага музычнага фальклору (ладавых, рытмічных эталонаў, тыповых напеваў і інш.); фарміраванне ўяўленняў аб фальклорным мастацтве (жанрах, музычных інструментах, спецыфічнасці абрадавага боку і інш.) і яго творах; удасканаленне ўменняў і навыкаў музычнай дзейнасці (навыкі выканальніцкай і творчай музычнай дзейнасці).

*Выхаваўчыя*: выхаванне павагі і інтарэсу да нацыянальнай музычнай спадчыны.

*Развіццёвыя*: развіццё музыкальнасці і музычна-творчых здольнасцей.

*Сацыялізуючая:* далучэнне да нацыянальнай культуры.

# КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ТЭХНАЛОГІІ

*Музычна-эстэтычная культура асобы ўяўляе сабой меру засваення ёю музычнай культуры грамадства ва ўсёй яе разнастайнасці.*

Паняцце "культура" вельмі шматграннае, аб чым сведчаць разнастайныя яго інтэрпрэтацыі. Калі разглядаць культуру як цэласную з'яву, то магчыма вылучыць некалькі яе маштабаў: культура чалавецтва; культура розных нацыянальных, сацыяльных, узроставых груп; культура асобы. Апошняя ў сувязі з тым, што чалавек з моманту свайго нараджэння змешчаны ў свет культуры і непазбежна павінен яе "распрадмечваць", гэта значыць, з дапамогай існуючых у яго здольнасцей і спосабаў дзеяння расшыфраваць закладзеныя ў культуры каштоўнасці і сэнсы, уяўляе сабой меру, ступень авалодвання чалавекам разнастайных пластоў (у тым ліку духоўнага, эстэтычнага, музычнага) агульначалавечай і нацыянальнай культуры.

Культура асобы пэўнага ўзросту абмяжоўваецца тымі ўзроставымі магчымасцямі, якія мае індывід на пэўным этапе свайго развіцця. Так, сутнасць кампанентаў музычна-эстэтычнай культуры, як і паказчыкі яе сфарміраванасці, будуць значна адрозніваццa, напрыклад, у дзяцей старэйшага дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту і г. д.

*Музычная мова з'яўляецца семіатычнай (знакавай) сістэмай і засвойваецца ў дзяцінстве дастаткова рана і адразу як сістэма.*

Разглядванне музычнай мовы як семіатычнай сістэмы (М. Араноўскі) ставіць яе ў адзін рад з іншымі знакавымі сістэмамі (напрыклад, з вербальнай), што дапускае і сходныя меха-

нізмы іх засваення. Музыка кожнага стылю (у тым ліку і нацыянальнага) можа разглядацца як спецыфічная мова, а здольнасці чалавека да авалодвання ёю з цягам часу "згасаюць" (М. Ратэрштэйн), у выніку чаго сталы чалавек можа апынуцца ў адносінах да «мовы» асобных музычных стыляў у становішчы "Маўглі". Па сцвярджэнні К. Ул. Тарасавай, музычная мова, як і маўленне, засвойваецца ў дзяцінстве дастаткова рана і інтуітыўна, адразу як сістэма ў адзінстве трох асноўных частак: семантыкі, лексікі і граматыкі. Пры ўспрыманні асобай дастатковай колькасці аднастылёвых музычных узораў фарміруецца "пачуццё стылю". Менавіта наяўнасць гэтага пачуцця Дз. К. Кірнарская прапануе лічыць паказчыкам развітай музыкальнасці чалавека. Тлумачыцца гэта тым, што разуменне стылістыкі пэўнага музычнага пласта патрабуе падсвядомага разумення ладавай, меладычнай, рытмічнай будовы гэтых узораў і сведчыць аб пэўным узроўні развіцця музычнага слыху, музычна-рытмічнага пачуцця, музычнага мыслення, музычнай памяці – тых музычных здольнасцяў, якія большасць даследчыкаў звязваюць з паняццем "музыкальнасць" (Б. М. Цяплоў, Н. А. Вятлугіна, К. Ул. Тарасава) або "музычна-эстэтычная свядомасць", якія ў сваю чаргу з'яўляюцца кампанентамі музычнай і музычна-эстэтычнай культуры асобы (Н. Ул. Гузій, В. М. Дароніна, С. А. Карташоў, І. Кевішас, В. П. Радынава, Р. А. Цельчарава і інш.)

Неаднаразова ўспрынятыя музычныя інтанацыі становяцца ўсё больш звычнымі для слыху дзіцяці, знаёмымі, распазнавальнымі, выклікаюць эмацыянальна станоўчыя адносіны, што ў сваю чаргу сведчыць аб падсвядомым пазнанні маленькім слухачом лексічных і структурных заканамернасцей пэўнага пласта музычнай культуры. У сувязі з гэтым рэпертуар, які выкарыстоўваецца ў працэсе музычнага выхавання дашкольнікаў, мае прынцыповае значэнне для далейшага музычнага развіцця дзіцяці, фарміравання асноў яго музычна-эстэтычнай культуры. На неабходнасці фарміравання ў слухачоў "музычна-інтанацыйнага слоўніка" акцэнтаваў сваю ўвагу яшчэ Б. Асаф'еў, на гэтую ідэю ў сучасных даследаваннях абапіраецца В. П. Радынава ў пытаннях далучэння дашкольнікаў да класічнай музыкі.

Фальклор з'яўляецца "азбукай" нацыянальнай музычнай мовы, тым універсальным матэрыялам, які адказвае патрабаванням мастацкасці і даступнасці. Безумоўна, у працэсе далучэння дашкольнікаў да нацыянальнага музычнага фальклору фарміруюцца не толькі агульныя першапачатковыя ўяўленні аб нацыянальнай культуры, жыцці і традыцыях беларускага народа, але і складаецца слоўнік найбольш характэрных для нацыянальнай культуры музычных інтанацый, своеасаблівых "эталонаў" нацыянальнай музычнай мовы, многія з якіх прысутнічаюць і ў сучаснай пісьмовай музычнай культуры, што дазваляе палегчыць слухачу ўспрыманне фальклорных твораў і з'яў сучаснай нацыянальнай культуры.

Фальклор фіксуе ў сваіх узорах этапы станаўлення музычнага мыслення Чалавека (у філагенэзе) і таму з'яўляецца ўніверсальным матэрыялам для развіцця музычнага мыслення і музычных здольнасцей дашкольніка (у антагенэзе).

Прыкладамі такой фіксацыі ў добра захаваных архаічных фальклорных узорах з'яўляюцца розныя тыпы інтанавання (паводле Э. Аляксеева) – гульня рэгістрамі голасу (кантрасна-рэгістравыя спевы); глісандуючае і танальнае інтанаванне і інш. Наяўнасць усіх гэтых тыпаў інтанавання фіксуецца даследчыкамі ў дзіцячай песнатворчасці (Т. І. Калужнікава, Г. М. Навуменка). Аналагічным чынам зафіксаваныя ў фальклоры розныя ладавыя сістэмы (пачынаючы з секундавых, разнастайных тэрцыявых ладоў і завяршаючы актаўнымі ладамі) прысутнічаюць і ў індывідуальным развіцці ладавага пачуцця. Яшчэ адным прыкладам можа быць наяўнасць тыповых напеваў (калі шмат фальклорных узораў інтануюцца на аснове адной мадэлі) як у значнай частцы гістарычных пластоў фальклору (за выключэннем познатрадыцыйнага пласта), так і ва ўзорах дзіцячай песнатворчасці. На гэтую асаблівасць звяртаў увагу беларускі даследчык музычнага фальклору Ул. І. Ялатаў. Такім чынам, фальклор прапануе ўзоры, якія могуць стаць для асобы своеасаблівай школай засваення агульных музычных заканамернасцей, школай развіцця музычнага мыслення і слыхавых здольнасцей.

*Засваенне нацыянальнай музычнай мовы адбываецца ў адпаведных відах музычнай дзейнасці, якія з улікам сінкрэтычнасці (злітнасці ўсіх элементаў) фальклору выступаюць ў адзінстве паміж сабой і некаторымі іншымі відамі дзіцячай дзейнасці (маўленчай, мастацкай, гульнёвай).*

Айчынная тэорыя здольнасцей (Б. М. Цяплоў, С. Л. Рубінштэйн, К. К. Платонаў) зыходзіць з прынцыпу адзінства прыроднага і сацыяльнага ў іх развіцці і пастулюе, что менавіта ўключэнне ў адпаведную дзейнасць дазваляе развіваць індывідуальныя задаткі асобы. Для айчыннай сістэмы музычнага выхавання дашкольнікаў выкарыстанне ўсіх відаў дзіцячай музычнай дзейнасці (успрыманне, спевы, музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне, музычная творчасць) ужо традыцыйна і дазваляе ўсебакова развіваць музычныя здольнасці дзіцяці. Але фальклор мае некаторую перавагу перад іншым музычным рэпертуарам ў тым, што кожны яго твор ужо першапачаткова, дзякуючы яго сінкрэтычнай прыродзе, мае патэнцыяльную магчымасць для ўключэння аднаго твора адразу ў некалькі відаў дзіцячай дзейнасці. Акрамя таго, цесная сувязь фальклору з жыццём дазваляе далучаць да музычнай дзейнасці амаль што ўсе віды дзейнасці дзяцей, у якой музычны фальклор можа як растварацца, так і з'яўляцца цэнтрам, які аб'ядноўвае некалькі відаў дзіцячай дзейнасці.

# АСНОЎНЫЯ ПЕДАГАГІЧНЫЯ СРОДКІ ТЭХНАЛОГІІ І ІХ ХАРАКТАРЫСТЫКА

У тэхналогіі вылучаюцца наступныя сродкі фарміравання музычна-эстэтычнай культуры старэйшых дашкольнікаў: узоры музычнага фальклору; узоры літаратурнага фальклору; дыдактычны матэрыял і цацкі; гульнёвыя сітуацыі і сюжэтнасць заняткаў; сумесная дзейнасць і зносіны дарослага з дзецьмі.

**Узоры музычнага фальклору.** Творы беларускага музычнага фальклору з'яўляюцца асноўным сродкам тэхналогіі. Музычны фальклор беларусаў вельмі багаты: гэта песенныя, танцавальныя, інструментальныя творы, розныя па сваім функцыянальным прызначэнні. Таму прынцыпова важна разгледзець некаторыя асаблівасці дадзенага матэрыялу, каб мець магчымасць адбіраць з усёй разнастайнасці фальклору тыя яго ўзоры, што дазваляць мэтанакіравана вырашыць пытанні фарміравання музычна-эстэтычнай культуры дашкольнікаў.

Музычны фальклор як від мастацтва незалежна ад яго нацыянальнай прыналежнасці мае *спецыфічныя рысы,* якія значна адрозніваюць яго ад музыкі пісьмовай традыцыі і павінны ўлічвацца ў арганізацыі працы з дашкольнікамі. Звернем увагу на тыя з іх, якія можна лічыць найбольш значнымі з пункту гледжання аспектаў далучэння да фальклору.

1. *Вуснасць* народнай музыкі. Менавіта вуснасць абумоўлівае спецыфічнасць форм і характар фальклорнай музыкі і з'яўляецца галоўнай якасцю, якая значна адрознівае фальклор ад пісьмовай культуры. Пісьмовая культура носіць сёння дамінуючы характар: у выніку гэтага з'явы вуснай культуры вывучаюцца на ўсіх узроўнях музычнай адукацыі праз прызму прын-

цыпаў пісьмовай культуры. Такі падыход да вывучэння фальклору крытыкуецца сучаснымі даследчыкамі.

З улікам спецыфікі дашкольнага ўзросту няма неабходнасці акцэнтаваць увагу на вусным "уваходжанні" ў фальклор, што мае прынцыповае значэнне для тых узроўней адукацыі, дзе слухачы больш знаёмыя з пісьмовай традыцыяй і неабходна пазбегнуць адмоўнага пераносу навыкаў успрымання і выканання музыкі пісьмовай традыцыі. Уваходжанне дзіцяці ў музычную культуру заўсёды вуснае. Непасрэдным жа вывадам, які мае метадычнае значэнне, будзе пераважлівасць вывучэння песеннага фальклору "з голасу" без выкарыстання інструмента, што дае магчымасць выкарыстоўваць найбольш зручныя дыяпазоны, інтанаваць больш чыста.

2. Вуснасць фальклору абумоўлівае наступную яго рысу – спецыфічныя *механізмы перадачы і ўспрымання.* Фальклор уяўляе сабой кантактны тып камунікацыі, натуральны тып мастацкіх зносін. Таму непасрэдны кантакт, натуральнае для фальклору бытавое і прыроднае асяроддзе з'яўляецца важнай умовай яго ўспрымання. Але знаёмства з фальклорам ва ўмовах дашкольнай установы непазбежна звязана з такой з'явай, як фалькларызм – існаванне фальклору ў іншых відах культуры, дзе ён непазбежна прапануецца слухачу ў другасных формах (у апрацоўках). Аднак больш адэкватныя ўяўленні аб фальклоры могуць даць аўтэнтычныя запісы, якія дазваляюць паменшыць супярэчнасці паміж неабходнасцю і немагчымасцю непасрэднага кантакту ва ўмовах адукацыйнай установы. Акрамя таго, дапамагчы стварэнню блізкага да натуральнага бытавога асяроддзя можа далучэнне да працэсу знаёмства з музычным фальклорам разнастайнага этнаграфічнага матэрыялу, адпаведнай інфармацыі і прадметаў матэрыяльнай культуры.

3. Наступныя рысы – *варыянтнасць* і *варыятыўнасць* фальклору, якія таксама з'яўляюцца вынікам вуснасці гэтага віду мастацтва. *Варыянтнасць* – гэта форма існавання фальклору і адлюстроўваецца яна ў варыянтах фальклорнага твора (у гэтым выпадку існуе агульная мадэль – інварыянт, на аснове якога можа будавацца вялікая колькасць твораў, якія нязначна адрозніваюцца тэкстам або мелодыяй). Варыятыўнасць – гэта спосаб існа-

вання фальклорнай традыцыі, які падкрэслівае імправізацыйны характар стварэння фальклорнага ўзору. Падкрэсліванне варыятыўнасці фальклору пры азнаямленні з ім і больш глыбокае яго засваенне праз стварэнне ўласных варыянтаў на аснове зафіксаванага фальклорнага твора, які будзе выступаць у гэтым выпадку своеасаблівым інварыянтам, можа дапамагчы засвоіць сам механізм вуснай музычнай творчасці. Такім чынам, варыянтнасць фальклору можа быць адлюстравана праз дэманстрацыю дашкольнікам розных варыянтаў аднаго твора, а варыятыўнасць – праз пабуджэнне дзяцей да стварэння ўласных імправізацый.

4. *Сінкрэтычнасць* фальклору, якая выражаецца праз злітнасць шматлікіх элементаў (музыкі, спеваў, рухаў, гульні). Менавіта сінкрэтычнасць робіць музычны фальклор прывабным і даступным для дашкольнікаў, светаўспрыманне якіх таксама з'яўляецца сінкрэтычным.

5. *Наяўнасць тыповых напеваў*, якія як своеасаблівыя формулы «вандруюць» з аднаго твора ў другі ў межах аднаго жанру (асабліва ў жанрах абрадавага фальклору). У выніку гэтага такія музычныя ўзоры маюць падобную ладавую або рытмічную будову, якая адчуваецца слухачом як нацыянальна спецыфічная, адлюстроўвае інтанацыйную самабытнасць беларускай народнай музыкі. Засваенне дашкольнікамі гэтых тыповых інтанацый з'яўляецца неабходнай "школай" фарміравання навыкаў чыстага інтанавання, глыбокага засваення найбольш характэрных для нацыянальнай музычнай мовы інтанацый.

Коратка ахарактарызуем тыя асаблівасці беларускага музычнага фальклору, якія, з аднаго боку, могуць лічыцца нацыянальна-характэрнымі, а з другога – быць даступнымі для засваення дашкольнікамі.

Адна з самых устойлівых прымет нацыянальнай характэрнасці – *ладавы бок* беларускага музычнага фальклору. Сярод разнастайных ладоў найбольш характэрнымі і даступнымі для засваення дашкольнікамі з'яўляюцца наступныя:

*секундавыя* (два суседніх гукі), якія распаўсюджаны ў жанрах дзіцячага фальклору і дзіцячай песнатворчасці;

*тэрцыевыя* (тры гукі), нацыянальна-спецыфічным варыянтам якіх з'яўляецца вельмі распаўсюджаны ў жніўных, дзіцячых песнях, калыханках *тэрцыевы лад з субквартай* (напрыклад: *рэ* 1 – *соль* 1 – *ля* 1 – *сі* 1), у якім да ніжняга тону тэрцыевага ладу дадаецца незапоўненая кварта (у разглядаемым выпадку *рэ* 1) і які між іншым ужо мае мажорнае або мінорнае нахіленне ў залежнасці ад верхняга гуку тэрцыі (у разглядаемым выпадку *сі* 1 дае мажорнае нахіленне, *сі-бемоль* 1 – мінорнае);

*з цэнтральнай тонікай,* якія ўтварыліся з тэрцыевых ладоў з субквартай у працэсе запаўнення субкварты паслядоўнасцю гукаў (чатыры гукі ніжняга тэтрахорду, напрыклад: *рэ* 1 – *мі* 1 – *фа* 1 – *соль* 1) і дабаўленнем верхняга гуку да тэрцыі (чатыры гукі верхняга тэтрахорду, напрыклад: *соль* 1 – *ля* 1 – *сі* 1 – *до* 2), тоніка ў якіх застаецца ў цэнтры (у разглядаемым выпадку – *соль* 1), а крайнія гукі (ладавая рамка) утвараюць малую сэпціму (*рэ* 1 – *до* 2);

*з ніжняй тонікай*, якія ўзніклі ў выніку пераасэнсавання ладавых узаемаадносін у ладах з цэнтральнай тонікай. Сярод апошніх вылучаюцца лад з ладавай рамкай "малая сэпціма", квінтовы лад (пяць ступеняў у межах квінты гукаў), актаўныя лады (звычныя нам мажор і мінор);

*пентатоніка* (пяць ступеняў у межах актавы), якая з'ўляецца эпізадычным ладам у беларускім фальклоры (сустракаецца толькі безпаўтонавая пентатоніка, якую могуць утвараць, напрыклад, наступныя гукі: *до* 1 – *рэ* 1 – *мі* 1 – *соль* 1 – *ля* 1; *рэ* 1 – *мі* 1 – *соль* 1 – *ля* 1 – *до* 2; *мі* 1 – *соль* 1 – *ля* 1 – *до* 2 – *рэ* 2 і г. д.); але пентатанічныя абароты дастаткова распаўсюджаны ва ўзорах розных жанраў (веснавых песнях, жанрах дзіцячага фальклору) і надаюць гэтым творам незвычайную выразнасць і каларыт.

Існуюць нацыянальна-характэрныя рысы і ў рытмічнай арганізацыі твораў беларускага фальклору. Для нас найбольш цікавыя наступныя з іх:

*тыповыя рытмічныя малюнкі* ва ўзорах абрадавага фальклору, напрыклад два чатырохдольнікі ў вяснянках, купальскіх песнях, характэрныя рытмічныя схемы ў калядках, шчадроўках, схема з распевам пятага гуку ў калядных, жніўных, восеньскіх, лірычных песнях;

разнастайныя *рэфрэны* (прыпевы, запевы, устаўкі, эмацыянальныя выгукі, выклічнікі і інш.), якія звычайна рытмічна адрозніваюцца ад іншых музычных фраз твора і жанрава акрэсліваюць яго (напрыклад, выклічнікі "А!", "У!" у веснавых песнях, "а-а-а" – у калыханках, "Каляда!" – у калядках і інш.).

Гэтыя асаблівасці фальклору дазваляюць вылучыць некаторыя рэкамендацыі, якія датычацца *адбору музычнага фальклорнага матэрыялу* пры далучэнні дашкольнікаў да гэтага віду мастацтва. Асноўнымі сярод іх можна лічыць наступныя:

разам з зафіксаванымі пісьмовай культурай традыцыйнымі ўзорамі і апрацоўкамі фальклору пажадана выкарыстоўваць *гуказапісы аўтэнтычнага гучання*;

пры наяўнасці варыянтаў вакальнага твора з акампанементам і без яго неабходна аддаваць перавагу *выкананню a capella*;

адбіраць для дашкольнікаў тыя ўзоры музычнага фальклору, у якіх прысутнічаюць *найбольш характэрныя рытмічныя і ладавыя формулы*;

па магчымасці даносіць да маленькіх слухачоў *некалькі варыянтаў аднаго твора* з наступным развучваннем аднаго з іх і *імправізацыяй дзецьмі ўласных варыянтаў*;

знаёміць з *рознымі жанрамі* музычнага фальклору і *рознымі тыпамі інтанавання* ў працэсе выканання вакальных твораў і *ўласных імправізацый у розных жанрах*;

выконваць патрабаванне *даступнасці* зместу фальклорнага твора;

выкарыстоўваць *усе віды дзіцячай музычнай дзейнасці* (а па магчымасці *іншыя віды дзейнасці* дашкольнікаў) пры вывучэнні фальклорнага твора з *уводзінамі слухачоў у кантэкст*, у якім гэты твор існаваў і існуе.

**Узоры літаратурнага фальклору**. Сінкрэтычнасць фальклорнага мастацтва і дзіцячай дзейнасці патрабуе выкарыстання ў тэхналогіі некаторых жанраў літаратурнага фальклору. Гэты матэрыял дае дадатковыя магчымасці ў развіцці маўлення дзіцяці, дазваляе зрабіць азнаямленне з музычным матэрыялам больш займальным, адыгрывае пэўную ролю ў музычным развіцці.

Міністэрства шляхоў зносін
Рэспублікі Беларусь
Беларуская чыгунка
№ 6
№
№ ад

Найбольшую сферу прымянення могуць атрымліваць лічылкі, якія выкарыстоўваюцца ў мэтах арганізацыі гульнёвай дзейнасці дашкольнікаў, пры гэтым яны абавязкова звязваюцца з тэмай твораў або яго персанажамі. Народныя казкі дазваляюць звязваць з'явы музычнага фальклору з пэўнымі сітуацыямі жыцця (напрыклад, спевы калыханкі ў казцы "Ціліпка-сынок", абрад калядавання ў казцы "Як воўк калядаваць хадзіў"), выкарыстоўваць тэксты персанажаў казак з мэтай развіцця музычна-творчых здольнасцей дзяцей (казкі "Баран – бок абадран", "Людзей слухай, а свой розум май"). З мэтай больш эфектыўнага засваення музычных сродкаў, характэрных для розных жанраў, могуць быць прапанаваны тэксты замоў ("Ідзі ж ты хвароба...", "Ідзі, зіма, да Кракава...") і незанатаваных калыханак.

Такая рыса фальклору, як варыянтнасць, датычыцца і тэкставага боку яго твораў. Параўнанне некалькіх варыянтаў тэкстаў узораў музычнага фальклору пабуджае дзіця да разумовай актыўнасці, узбагачае слоўнік дзіцяці сінонімамі, параўнаннямі і г. д.

**Дыдактычны матэрыял і цацкі**. Да дыдактычнага матэрыялу ў першую чаргу належаць камплекты картак, якія выкарыстоўваюцца і пры дыягностыцы, і пры непасрэднай рэалізацыі метадычнага блока тэхналогіі. Сярод іх:

карткі, выявы на якіх сімвалізуюць пэўныя з'явы (віды дзіцячай музычнай дзейнасці, функцыянальнае прызначэнне жанраў, адценні характару музыкі, мімічныя мадэлі);

фотаздымкі або карткі з выявамі рэальных прадметаў – музычных інструментаў, адзення, прадметаў побыту, прыладаў працы і інш.;

каляровыя карткі, з дапамогай якіх удакладняецца характар і настрой твораў;

індывідуальныя карткі, выкананыя па тыпу "размалёвак", на якіх адлюстраваныя персанажы рознахарактарных твораў.

Цацкі дапамагаюць у стварэнні гульнёвых сітуацый і разгортванні сюжэтнай лініі занятку. Найбольш аптымальным з'яўляецца выкарыстанне персанажаў батлеечнага тэатра.

**Гульнёвыя сітуацыі і сюжэтнасць заняткаў**. Неабходнасць выкарыстання гэтага сродку абумоўлена, па-першае, узроставымі

асаблівасцямі дашкольніка, па-другое – спецыфікай фальклорнага мастацтва, якое цесна звязана з жыццём і можа быць адлюстравана праз пэўныя сюжэты – знаёмства з “жыхарамі вёскі”, іх жыццём і дзейнасцю; удзел у трансфармiраваных, прыстасаваных да ўмоў дашкольнай установы абрадавых “эпізодаў” і інш.

**Сумесная дзейнасць і зносіны дарослага з дзецьмі**. Фальклор – мастацтва дэмакратычнае і калектыўнае, у сваёй аснове дазваляе ўсім удзельнікам праявіць сябе, нават асобам са сціплымі музычнымі дадзенымі. Гэта дазваляе ажыццяўляць індывідуальны падыход да кожнага дзіцяці, улічваць асабовыя якасці і ўзровень развіцця музычных і творчых здольнасцей. Пры гэтым дарослы павінен праявіць сябе як актыўны ўдзельнік ва ўсіх прапанаваных ім заданнях. Асаблівая роля належыць яму ў арганізацыі творчай дзейнасці – ад дэманстрацыі ўласных творчых прадуктаў да кіравання творчымі праявамі кожнага з дзяцей. Выкарыстоўваюцца пры гэтым традыцыйныя наглядныя (слыхавая нагляднасць, калі размова ідзе аб музычным фальклоры, і зрокавая нагляднасць, калі неабходна ўвесці дзяцей у кантэкст існавання і выканання твору), славесныя метады (расказ, гутарка, інструкцыя і інш.). Найбольш эфектыўнымі практычнымі метадамі з’яўляюцца метады прыпадабнення (мімікі, маторыкі, коляру і інш.) да характару гучання музыкі, метады мадэліравання гукавысотных, рытмічных адносін.

# ХАРАКТАРЫСТЫКА ДЫЯГНАСТЫЧНАГА БЛОКА ТЭХНАЛОГІІ

Музычна-эстэтычная культура асобы з'яўляецца шматкампанентным фенаменам і адлюстроўвае цэлы комплекс музычнага і інтэлектуальнага развіцця асобы. Адпаведна і дыягностыка гэтай інтаграванай якасці складаецца з дыягностыкі праяў музыкальнасці, музычна-эстэтычнай свядомасці, узроўню авалодвання музычнай дзейнасцю.

Структура музычна-эстэтычнай культуры дашкольніка графічна адлюстравана на рыс. 1.




*Рыс. 1.* Структура музычна-эстэтычнай культуры дашкольніка

Музычна-эстэтычная свядомасць разам з музыкальнасцю ствараюць адну плоскасць музычна-эстэтычнай культуры дашкольніка, з'яўляючыся яе ўнутранымі праявамі, музычная дзейнасць – іншую плоскасць знешніх праяў. Аднак, зыходзячы з прынцыпу адзінства свядомасці і дзейнасці, узаемасувязь і ўза-

емазалежнасць гэтых кампанентаў відавочна: якасць свядомасці і здольнасці ў дзейнасці фарміруюцца, і ў той жа час узровень авалодвання дзейнасцю сведчыць аб узроўні развіцця і сфарміраванасці здольнасцей і складаемых свядомасці. Кампаненты музычна-эстэтычнай свядомасці і музыкальнасці таксама цесна паміж сабой звязаны. Так, музычнае мысленне некаторыя даследчыкі адносяць да праяў музыкальнасці (К. Ул. Тарасава), а музычна-моўная здольнасць з'яўляецца і фенаменам музычнай свядомасці (Дз. К. Кірнарская). Таму такое падзяленне носіць у пэўнай ступені ўмоўны характар і ўсе ўнутраныя праявы музычна-эстэтычнай культуры непазбежна змыкаюцца паміж сабой.

Музычны фальклор мае свае спецыфічныя магчымасці ў фарміраванні асобных кампанентаў музычнай культуры дзіцяці, якія павінны ўлічвацца як пры дыягностыцы, так і пры азначэнні зместу работы па далучэнні дашкольнікаў да музычнага фальклору дзеля найбольш поўнага выкарыстання ўсіх магчымасцей гэтага віду мастацтва ў музычным развіцці дзіцяці.

Акрамя таго, спецыфіка далейшых фарміруючых уздзеянняў звязана з пэўным музычным матэрыялам, таму ўсе дыягнастычныя заданні павінны абапірацца менавіта на фальклорны рэпертуар, паколькі ён адлюстроўвае як агульныя заканамернасці музыкі, так і спецыфічныя рысы фальклору і асаблівасці менавіта беларускага музычнага фальклору.

Адной з яскравых праяў ***музыкальнасці*** дашкольніка з'яўляецца *эмацыянальная спагадлівасць* на музыку. Яна можа разглядацца не толькі як непасрэдная рэакцыя на настрой, характар гучання музыкі і быць звязанай з тыпам нервовай сістэмы, актыўнасцю і жвавасцю эмацыянальнай сферы, але і як праяўленне эмацыянальна-маральнай спагадлівасці, уменне ўспрымаць музычны твор як зварот да слухача жывога суб'екта, уменне паставіць сябе на месца іншага, адчуць яго эмацыянальны настрой, эмацыянальныя адценні музыкі. Фальклор у гэтым сэнсе не з'яўляецца выключэннем з агульных правілаў, якім падпарадкоўваецца музычнае мастацтва: з'яўляючыся мастацтвам выразным, музыка перадае разнастайныя пачуцці, настроі, эмацыянальныя становішчы і, вядома, праз "расшыфроўку" гэтага

зместу музыкі адбываецца развіццё эмацыянальнай спагадлівасці.

Пры *дыягностыцы праяў эмацыянальнай спагадлівасці* з выкарыстаннем фальклорнага рэпертуару можна выкарыстоўваць наступныя дыягнастычныя заданні.

1. *Назіранне за знешнімі рэакцыямі дзяцей падчас успрымання твору.*

*Змест*: падгрупе дзяцей двойчы пачаргова прапаноўваецца праслухаць урыўкі танцавальнага найгрыша і прычыта (кантрасных па характары і функцыям жанраў). Перад першым слуханнем даецца ўстаноўка на ўважлівае ўспрыманне музыкі, перад другім прапануецца "паказаць" з дапамогай мімікі, рухаў, жэстаў настрой музыкі.

Вынікі фіксуюцца з улікам наступных крытэрыяў:

- працягласць увагі і зацікаўленасць пры першым праслухоўванні. Па гэтаму крытэрыю даследчык ставіць 0 балаў у выпадку няўважлівага ўспрымання, адсутнасці зацікаўленасці, частковага праслухоўвання; 1 бал – калі дзіця праяўляе інтарэс, увагу, аднак непрацяглы час; 2 балы – у выпадку зацікаўленага праслухоўвання ўрыўка цалкам;
- адэкватнасць знешніх рэакцый (міміка, жэсты, смех, рухавыя рэакцыі) на музычныя ўрыўкі пры другім праслухоўванні.

Адэкватная рэкцыя на кожны з урыўкаў ацэньваецца ў 2 балы, у выпадку наяўнасці рухавай рэакцыі на танец дадаецца 1 бал.

Балы, атрыманыя падчас назірання, сумуюцца, іх колькасць адпавядае ўзроўню знешняй рэакцыі на музыку (0–3 – нізкі ўзровень, 4–6 – сярэдні, 7–9 высокі).

2. *Практычнае заданне "Тварыкі"* (распрацавана К. П. Чумічовай і А. Ул. Шумаковай).

*Мэта*: выявіць адэкватнасць успрымання эмацыянальнага зместу, адценняў характару музыкі ў творах беларускага фальклору.

*Змест*: кожнаму дзіцяці падгрупы прапануецца: а) набор картак з умоўным абазначэннем чатырох эмацыянальных станові-

шчаў, якія неабходна суаднесці па ступені выражанасці эмацыянальнага становішча суму або радасці з прапанаванымі чатырма творамі беларускага музычнага фальклору; б) чатырохпавярховая "музычная хатка", у якую патрэбна паслядоўна "пасяліць" чалавечкаў згодна з разуменнем эмоцый і настрояў, выражаных у кожным урыўку (дадатак 1).

Перад выкананнем задання даецца інструкцыя: "Да нас прыйшлі эмацыянальныя чалавечкі, давайце разглядзім іх тварыкі. Што можна даведацца аб іх настроі, характары? (Дзеці сумесна з дарослым выяўляюць характэрныя для кожнага сімвала эмацыянальныя становішчы.) Чалавечкі жадаюць засяліцца ў новы домік, але толькі ў пакойчык на тым паверсе, дзе гучыць музыка, якая падыходзіць да іх па настрою. Уважліва праслухайце музычныя ўрыўкі і здагадайцеся, дзе які чалавечак жадае пасяліцца, паспрабуйце яго пасяліць". Праслухоўванне пачынаецца "з першага паверха хаткі". Пры паўторным успрыманні ўрыўкаў дзеці "засяляюць" хатку, удакладняюць правільнасць сваёй першай спробы.

Па выніках задання даследчык ставіць 3 балы, калі дзіця адэкватна суаднесла выяву з эмацыянальным зместам музычнага ўрыўка, 2 балы – пры памылцы ў вызначэнні роднасных эмацыянальных становішчаў, 0 балаў – пры памылцы ў ацэнцы кантрасных эмоцый. Даныя па чатырох урыўках сумуюцца.

Нізкаму ўзроўню праяўлення эмацыянальнай спагадлівасці па гэтаму крытэрыю адпавядаюць 0–3 балы, сярэдняму – 4–8, высокаму – 9–12 балаў.

Асноўнымі музычнымі здольнасцямі традыцыйна лічацца *музычна-рытмічнае пачуццё* (або пачуццё рытму) і *меладычны слых* (у адзінстве *ладавага пачуцця і музычна-слыхавых уяўленняў*).

Што датычыцца *музычна-рытмічнага пачуцця*, то яно выражаецца ў здольнасці эмацыянальна адчуваць выразнасць музычнага рытму і дакладна ўзнаўляць яго, гэта значыць, эмацыянальна адлюстроўваць рытмічны малюнак, метрычную аснову музыкі, тэмп і яго змяненні. Па дадзеным К. Ул. Тарасавай, пачуццё рытму ў дашкольнікаў фарміруецца пакампанентна: спачатку – па-

чуццё тэмпу, потым – пачуццё метру. Найбольшую складанасць нават для старэйшых дашкольнікаў, безумоўна, выклікае дакладнае адлюстраванне рытмічнага малюнка. Менавіта гэты напрамак у развіцці музычна-рытмічнага пачуцця патрабуе найбольшай увагі з боку педагога і павінен рэалізоўвацца шляхам засваення дзецьмі сістэмы рытмічных эталонаў. Фальклорны матэрыял дазваляе засвоіць пэўную колькасць такіх эталонаў, што звязана са шматразовым дубліраваннем у розных творах пэўных рытмічных малюнкаў, якія з'яўляюцца тыповымі для фальклору.

*Дыягностыка музычна-рытмічнага пачуцця* старэйшых дашкольнікаў можа абапірацца на выяўленне ўзроўню развіцця метрычнага пачуцця, умення ўзнавіць рытмічны малюнак, тыповы для фальклорных твораў.

## Заданне "Ігра ў ансамблі"

*Змест*: пасля ўспрымання выкананага дарослым чатырохфразавага ўрыўку танцавальнай мелодыі (напрыклад, "Юрачка") дзіцяці прапануецца «сыграць разам», суправаджаючы моцную долю ігрой на бубне. Выкананне ў ансамблі прадпрымаецца двойчы, фіксуецца вынік больш удалай спробы.

Вынікі выканання ацэньваюцца наступным чынам. У выпадку дакладнага ўзнаўлення метрычнай пульсацыі дзіця атрымлівае 2 балы (высокі ўзровень), пры выкананні з памылкамі – 1 (сярэдні ўзровень), пры выпадковых недакладных ударах – 0 балаў (нізкі ўзровень).

## Узнаўленне рытмічнага малюнка з дапамогай пляскання ў далоні

*Змест*: для даследвання адбіраюцца сем песенных чатырохтактавых урыўкаў, якія могуць лічыцца своеасаблівымі рытмічнымі эталонамі музычна-фальклорнай рытмікі. Урыўкі выконваюцца даследчыкам на інструменце. Пасля першага праслухоўвання ўрыўка перад дашкольнікам ставіцца задача прахлопаць рыт-

мічны малюнак падчас паўторнага выканання яго дарослым. Кожны дакладна адлюстраваны рытмічны малюнак ацэньваецца ў 1 бал, пры недакладнасці – у 0,5, пры хаатычных хлапках або фіксацыі дашкольнікам толькі метрычнай пульсацыі – 0 балаў.

Да высокага ўзроўню развіцця здольнасці ўзнаўляць чаргаванне гукаў рознай працягласці адносяцца дзеці, якія атрымалі 4,5–7 балаў, да сярэдняга – 2–4, да нізкага – да 1,5 балаў.

*Ладавае пачуццё* – гэта здольнасць распазнавання ладавых функцый гукаў мелодыі, калі ўсе яе гукі ўспрымаюцца ў іх адносінах да тонікі і іншых ступеняў ладу. Менавіта развітае ладавае пачуццё дазваляе адчуваць эмацыянальную выразнасць мелодыі. Для дзяцей дашкольнага ўзросту (і нават малодшых школьнікаў) асноўную інфармацыю аб характары музыкі нясе не столькі яе ладавая арганізацыя, колькі дынаміка, рэгістр, тэмп. Але, па дадзеным К. Ул. Тарасавай, меладычная арыентацыя пры ўспрыманні музыкі, якая сведчыць аб разуменні слухачом узаемазалежнасцей гукаў, распазнаванне мелодыі ў незалежнасці ад змены тэмпу, рэгістра, дынамікі, з'яўляецца ўжо ў пяцігадовым узросце. Садзейнічаць станаўленню меладычнай арыентацыі можа сістэматычная работа па назапашванню дашкольнікамі слоўніка мелодый-інтанацый у працэсе ўспрымання музыкі і спеваў. Традыцыйна ў музычным выхаванні дашкольнікаў шырока выкарыстоўваюцца творы, якія маюць у сваёй аснове мажор і мінор – актаўныя лады, шырока распаўсюджаныя ў еўрапейскай музыцы пісьмовай традыцыі. Гэта значна збядняе слыхавы вопыт дзіцяці і накіроўвае развіццё ладавага пачуцця менавіта па гэтым шляху. Лагічна дапусціць, што вузкааб'ёмныя (тэрцыевыя, квінтовыя і інш.) лады народнай музыкі больш даступныя для дзіцячага ўспрымання і іх засваенне павінна быць неабходным этапам у музычным развіцці дзіцяці. Наданне больш пільнай увагі ладавай разнастайнасці музыкі для дашкольнікаў дазволіць «акультурваць» іх у розных ладавых сістэмах, што адаб'ецца на якасці фарміруемага ладавага пачуцця.

Дзеля *дыягностыкі ўзроўню развіцця ладавага пачуцця* пажадана выкарыстоўваць як заданні, накіраваныя на размежаванне мажорнай і мінорнай афарбоўкі ладу, так і заданні, якія дазваляць

дыягнаставаць усведамленне ладавых адносін гукаў у спецыфічных для беларускага фальклору ладах (у дадзеным выпадку – у тэрцыявым ладзе з субквартай).

## Заданне "Светлафор"

*Мэта*: а) ацэнка ўяўленняў дзіцяці аб найбольш устойлівым гуку ў тэрцыявым ладзе з субквартай; б) ацэнка здольнасці адрозніваць мажорную і мінорную афарбоўку (на прыкладзе двух напеваў у тэрцыявым ладзе з субквартай).

*Змест*: дарослы паведамляе дзіцяці, што «наш сённяшні госць (*дэманструецца прывабная для дзіцяці цацка*) вельмі любіць сам ствараць музыку, але не заўсёды выконвае сваю мелодыю да канца, часам яе хочацца падоўжыць далей. Я дам табе дзве карты – чырвоную і зялёную, як ў светлафоры. Пасля таго як наш госць сыграе і праспявае і ты вырашыш, што мелодыя завершана, пакажы чырвоную картку, каб ён не іграў далей. А калі ты лічыш, што яе трэба прадоўжыць, пакажы зялёную, каб ён працягваў». Пасля гэтага даследчык «разам з госцем» іграе і спявае (на любы склад) наступныя варыянты мелодый:

1. 

2. 

3. 

Лад-формула, якая выкарыстоўваецца ў такога рода напевах, мае, па Ул. Ялатаву, наступны выгляд:



Тонікай у ёй з'яўляецца гук "фа", таму чырвоная картка – "мелодыя скончана" павінна быць паказана ў варыянце 3. Вынікі ацэньваюцца наступным чынам: паказ чырвонай карткі ў варыянце 3 ацэньваецца ў 3 балы, у варыянце 2 – у 1, у варыянце 1 – у 0,5; у варыянтах 2 і 3 – у 2, у варыянтах 3 і 1 – у 1, у варыянтах 1 і 2 – у 0,5; ва ўсіх варыянтах – у 0,5 бала. Паказ зялёнай карткі ва ўсіх трох варыянтах ацэньваецца ў 0 балаў.

Далей дарослы ў размове ўдакладняе ўяўленні дзіцяці аб тым, які настрой быў у госця, калі ён ствараў гэтыя мелодыі (дзіця павінна вылучыць мажорную афарбоўку). Потым прапануецца праслухаць яшчэ адну песеньку госця і аналагічным чынам вылучыць настрой, які адпавядае мелодыі (мінорнае нахіленне). Выконваецца наступная папеўка:



Калі дзіця адчуе змену настрою (ладу), то атрымае яшчэ 1 бал.

Колькасць балаў па двух заданнях сумуецца. Нізкі ўзровень суадносіцца з 0–1 балам; сярэдні – 1,5–2,5; высокі – з 3–4 баламі.

Калі ладавае пачуццё – перцэптыўны (адказны за ўспрыманне) кампанент меладычнага слыху, то *музычна-слыхавыя ўяўленні* – рэпрадуктыўны (адказны за ўзнаўленне) кампанент меладычнага слыху і непасрэдна звязаны з інтанаваннем дзецьмі гукаў мелодыі голасам або выкананнем іх на музычным інструменце. Чыстае інтанаванне гукаў мелодыі з'яўляецца апошнім этапам у развіцці гэтай здольнасці, у той час як папярэднімі этапамі заваявання дзецьмі гукавой прасторы будуць гульня рэгістрамі голасу, прагаворванне слоў у рытме напеву, інтанаванне мелодыі на 1–2 гуках, узнаўленне агульнага напрамку мелодыі з чыстым інтанаваннем большай ці меншай колькасці яе гукаў.

*Дыягностыка гэтай здольнасці* звязана з ацэнкай выканання дашкольнікам пэўнага твора.

## Заданне "Праспявай песню"

*Мэта*: выявіць узровень дзіцяці ў інтанаванні мелодыі.

*Змест:* дзіцяці прапануецца выканаць песню па жаданні, тую, якую ён добра ведае, якая яму спадабаецца. Пры выкананні дарослы фіксуе ўзровень інтанавання мелодыі і ацэньвае яго (у балах): 0 – адказ ад выканання; 1 – прагаворванне слоў у адпаведнасці з рытмам мелодыі; 2 – інтанаванне мелодыі на 1–2 гуках; 3 – узнаўленне агульнага напрамку мелодыі; 4 – чыстае інтанаванне асобных урыўкаў на фоне вернага ўзнаўлення агульнага напрамку мелодыі; 5 – чыстае інтанаванне ўсёй мелодыі.

У фарміраванні складаемых *музычна-эстэтычнай свядомасці* музычны фальклор паспяхова садзейнічае фарміраванню *інтарэсу* дзяцей да музычнай дзейнасці. Злітнасць у адным творы шматлікіх элементаў (песня, танец, ігра на інструменце, гульня) дазваляе кожнаму дзіцяці праявіць сябе ў найбольш цікавых для яго відах музычнай дзейнасці і адначасова вымушае яго ўдзельнічаць у іншых відах, якія потым становяцца больш прывабнымі для дзіцяці.

## Заданне "Што цікавей?"

*Мэта*: выявіць інтарэс дашкольніка да розных відаў музычнай дзейнасці.

*Змест:* дзіцяці прапануецца серыя з пяці картак, якія сімвалічна адлюстроўваюць віды дзіцячай музычнай дзейнасці: успрыманне, спевы, музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне, творчасць. Неабходна зрабіць выбар тых відаў дзейнасці, якімі ён больш за ўсё цікавіцца. За кожны такі выбар дзіця атрымлівае 1 бал. Пасля гэтага прапануецца выбраць тыя віды, якія яму спадабаюцца, але дзіця не ўпэўнена ў поспеху. За кожны з такіх відаў дзейнасці залічваецца дадатковая адзнака «*».

Аб нізкім узроўні сфарміраванасці інтарэсу да віду музычнай дзейнасці сведчаць адзнакі 2** і ніжэй, аб сярэднім – 2***; 3; 3*, аб высокім – 3**; 4*; 5.

Музычнае мысленне дашкольніка трактуецца як усведамленне выразнасці музычнага вобраза на аснове распазнавання музычных інтанацый, іх змены і развіцця. *Рэпрадуктыўнае музычнае мысленне* звязана з разуменнем успрынятага музычнага вобраза, а ўзровень яго развіцця ў дашкольніка ацэньваецца па выказваннях аб настроі і характары музыкі, вылучэнні жанру твора, разуменні яго функцыянальнага прызначэння. У развіцці гэтай здольнасці фальклор не мае асаблівых пераваг перад іншым музычным рэпертуарам, напрыклад перад класічнай музыкай. Справа ў тым, што ў значнай колькасці выпадкаў асобны аўтарскі твор можа адлюстроўваць больш эмацыянальных адценняў, выкарыстоўваць яскравыя сродкі выразнасці. У фальклоры больш тыповасці інтанацый і рытмаў (за выключэннем позніх яго пластоў), а эмацыянальныя адценні аднародныя ў межах пэўнага жанру. Прынцыповая розніца ў характары і вобразах фальклору назіраецца пры супастаўленні твораў, якія належаць да розных жанраў. Таму, дзеля эфектыўнага развіцця рэпрадуктыўнага музычнага мыслення дашкольніка, пашырэння яго ўяўленняў аб характары музыкі, неабходна дэманстрацыя жанравай разнастайнасці фальклору, знаёмства з розным функцыянальным прызначэннем гэтых жанраў і, як вынік гэтага, – разуменне дашкольнікамі настрою і характару фальклорных твораў менавіта ў сувязі з жанрам.

*Дыягностыка гэтага боку музычнага мыслення* дзіцяці можа праводзіцца падчас выканання задання «Пазнай жанр».

### Заданне "Пазнай жанр"

*Мэта*: выявіць уяўленне аб жанрах з улікам спецыфікі фальклорных жанраў.

*Змест*: для выканання задання дарослы выкарыстоўвае ўрыўкі пяці твораў, якія маюць яскравыя жанравыя прыкметы (калыханка, забаўлянка, заклічка, прычыт, танец). Кожнаму з жанраў адпавядае картка-малюнак з адлюстраваннем яго функцыянальнага прызначэння. Пры праслухоўванні ўрыўкаў дзіця выкладвае паслядоўнасць картак. Кожны правільны адказ ацэнь-

ваецца ў 0,5 балаў. Пасля гэтага дзіця называе жанры. Кожны правільна названы жанр ацэньваецца ў 1 бал.

Аб нізкім узроўні сфарміраванасці ўяўленняў аб фальклорных жанрах сведчаць 0–3,5 балаў, аб сярэднім – 4–5,5 і аб высокім – 6–7,5 балаў.

Вельмі шырокія магчымасці мае фальклор у развіцці *прадуктыўнага музычнага мыслення,* якое праяўляецца ў дашкольнікаў праз стварэнне ўласных невялічкіх "сачыненняў", якія часцей за ўсё носяць імправізаваны характар – адначасова "мысляцца" і выконваюцца, ствараюцца "з ходу". Тыповасць рытмікі, ладавай будовы розных узораў фальклору ў межах пэўнага жанру (напрыклад, калыханак) значна палягчае стварэнне сваёй імправізацыі ў гэтым жанры, якая ў дадзеным выпадку ствараецца па пэўнай "формуле". Гэта робіць музычную творчасць даступным відам дзейнасці амаль для кожнага дзіцяці. Самі фальклорныя творы, як правіла, існуюць у вялікай колькасці варыянтаў, якія некалькі адрозніваюцца рытмікай, мелодыяй, тэкстам. Успрыманне іх дашкольнікамі дазваляе ім добра ўсвядоміць саму магчымасць варыятыўнага выкладання музычнага матэрыялу, убачыць варыянты змены твора, тым самым актывізаваць іх уласную творчасць.

Ацаніць *узровень развіцця прадуктыўнага мыслення* магчыма праз ацэнку творчага прадукта, напрыклад створанага дашкольнікам узору калыханкі падчас выканання задання.

### Заданне "Ствары сам"

*Мэта*: выявіць узровень развіцця прадуктыўнага музычнага мыслення ў працэсе вакальнай імправізацыі калыханкі.

*Змест*: пасля ўдакладнення дарослым уяўленняў дзіцяці аб жанры калыханкі яму прапаноўваецца самому стварыць яе варыянт для адной з цацак. Імправізацыя ацэньваецца па наступных крытэрыях:

адпаведнасць агульнага характару мелодыі жанру калыханкі;
адпаведнасць тэкста жанру калыханкі;
ступень арыгінальнасці мелодыі;
ступень арыгінальнасці тэксту;

меладычная разгорнутасць выказвання;
ступень разгорнутасці тэксту, наяўнасць рыфмы;
завершанасць музычнай думкі;
выкарыстанне тыповых для жанру рытма-інтанацыйных формул.

Вынік ацэньваецца наступным чынам: 0 балаў – адказ дзіцяці ад выканання задання; 1 бал – выконваецца вядомая дзіцяці калыханка; 2 балы – у імправізацыі выкарыстаны мелодыя вядомай дзіцяці калыханкі і ўласны варыянт неразгорнутага тэксту, адпаведнага жанру калыханкі; 3 балы – выкарыстаны тэкст вядомай калыханкі і свой варыянт мелодыі на 1–2 гуках, набліжаны да рэчытатыцыі; 4 балы – твор адпавядае жанру, але меладычна неразгорнуты, магчыма незавершанасць музычнай думкі, выкарыстоўваецца ўласны варыянт неразгорнутага тэксту; 5 балаў – імправізацыя меладычна неразгорнута, але музычная думка завершана, тэкст разгорнуты; 6 балаў – разгорнутая мелодыя адпавядае жанру, але тэкст уяўляе сабой распяванне складоў або асобных слоў (“а-а-а”, “баю-баю”); 7 балаў – разгорнутая меладычная лінія з неразгорнутым тэкстам, адпаведным жанру, магчыма наяўнасць рыфмы; 8 балаў – завершаная разгорнутая імправізацыя з тыповымі рысамі жанру і разгорнутым, магчыма зарыфмованым тэкстам.

Нізкаму ўзроўню развіцця прадуктыўнага музычнага мыслення адпавядае 0–3 балы, сярэдняму – 4–6, высокаму – 7–8 балаў.

Спецыфічныя магчымасці фальклору ў атрыманні *ведаў* аб музычным мастацтве датычацца ўдакладнення і пашырэння ўяўленняў дашкольнікаў аб музычных жанрах, тых з іх, якія прысутнічаюць у музыцы пісьмовай традыцыі (разнастайныя песенныя і танцавальныя жанры), знаёмства з музычнымі фальклорнымі жанрамі (заклічка, забаўлянка, жанры каляндарна-абрадавага фальклору і інш.). Знаёмства з гучаннем традыцыйных беларускіх музычных інструментаў (скрыпкі, цымбал, дуды, гармоніка, балалайкі і інш.), іх назвамі і асаблівасцямі канструкцыі дазволіць пашырыць уяўленні дзяцей аб музычных інструментах увогуле, актывізаваць іх музычнае ўспрыманне і разумовую актыўнасць (напрыклад, пры параўнанні гучання аднаго твора ў выкананні розных фальклорных інструментаў і інструментаў сімфанічнага аркестра).

## Заданне "Які інструмент? "

*Змест*: дзіцяці прапануецца камплект картак з выявамі беларускіх народных музычных інструментаў (скрыпка, дудка, падвойная дудка, дуда, гармонік, балалайка, колавая ліра, цымбалы, бубен, барабан). Веданне кожнага з такіх інструментаў, як дуда, колавая ліра, падвойная дудка, цымбалы, ацэньваецца ў 1 бал, веданне кожнага з астатніх інструментаў – у 0,5 балаў. Высокаму ўзроўню інфармаванасці аб беларускіх музычных інструментах адпавядае адзнака да 2,5 балаў, сярэдняму – 3–5, высокаму – 5,5–7 балаў.

Пры выяўленні ўзроўню сфарміраванасці музычнай дзейнасці дашкольніка ўлічваюцца наступныя крытэрыі: накіраванасць дзейнасці (віды музычнай дзейнасці дзіцяці, іх колькасць); ступень актыўнасці дзіцяці; эфектыўнасць (паспяховасць у дзейнасці); гарманічнасць (наяўнасць неабходных навыкаў выканання, творчых праяў у музычнай дзейнасці).

Нізкаму ўзроўню адпавядае наступная характарыстыка дзейнасці дзіцяці: праяўленне інтарэсу да 1–2 відаў музычнай дзейнасці; пасіўнасць на музычных занятках; удзел у якасці назіральніка ў іншых формах арганізацыі музычнага выхавання; пазбяганне выканання творчых заданняў.

Характарыстыка сярэдняга ўзроўню наступная: праяўленне інтарэсу да выканальніцкіх відаў дзейнасці, дастатковая паспяховасць у іх; праяўленне актыўнасці на занятках у залежнасці ад суб'ектыўных фактараў; інтарэс да дзейнасці пры падрыхтоўцы забаў, святаў, прычым пераважна калектыўным формам дзейнасці; выбарнасць у выкананні творчых заданняў.

Для высокага ўзроўню характэрна: наяўнасць інтарэсу і паспяховасці ва ўсіх відах музычнай дзейнасці; актыўнасць на музычных занятках і ў самастойнай музычнай дзейнасці падчас падрыхтоўкі забаў і святаў; паспяховасць у выкананні творчых заданняў.

Агульны ўзровень *сфарміраванасці музычна-эстэтычнай культуры старэйшага дашкольніка вылучаецца як сярэдняе арыфметычнае ўзроўняў развіцця ўсіх кампанентаў*.

# АСАБЛІВАСЦІ МЕТОДЫКІ ТЭХНАЛОГІІ

Працэс фарміравання музычна-эстэтычнай культуры старэйшых дашкольнікаў сродкамі фальклору па сутнасці ўяўляе сабой працэс распрадмечвання ўзораў музычнага фальклору праз актывізацыю і развіццё ўнутраных кампанентаў музычна-эстэтычнай культуры ў адпаведнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца праз узаемадзеянне дарослага і дзіцяці. Дадзены працэс прадстаўлены на рыс. 2.

Віды дзіцячай дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца ў фарміраванні музычна-эстэтычнай культуры старэйшых дашкольнікаў, адмечаны на сектарах правага эліпса, а якасці музычна-эстэтычнай свядомасці і музычныя здольнасці – левага. Умоўны ўзаемны рух двух эліпсаў (азначаны стрэлкамі) дазваляе атрымліваць розныя камбінацыі пры іх скрыжаванні, што адпавядае накіраванасці заданняў па распрадмечванні музычных фальклорных узораў. Пры гэтым узоры нацыянальнай фальклорнай культуры, праламляючыся праз індывідуальную свядомасць, здольнасці і дзейнасць падчас выканання заданняў, камбінацыю і паслядоўнасць якіх вылучае педагог, пераходзяць у асабістую спадчыну дашкольніка, утвараючы яго музычна-эстэтычную культуру.

Пры арганізацыі сістэматызаванага вывучэння беларускага музычнага фальклору з дашкольнікамі неабходна ўлічваць супярэчнасць паміж заканамернасцямі працэсу выхавання і аб'ектыўнымі асаблівасцямі фальклору. Логіка навучання і развіцця патрабуе паступовага ўскладнення вывучаемых з'яў, замацавання і супрацьпастаўлення вядомага з новым матэрыялам. У той жа час спецыфіка фальклору, значную частку якога складае ка-

ляндарна-абрадавы, патрабуе дакладнага суаднясення вывучэння твора з пэўным сезонам. Таму, на наш погляд, увесь прапанаваны для вывучэння старэйшымі дашкольнікамі фальклорны матэрыял неабходна і магчыма аб’яднаць у пэўныя тэмы, у межах якіх паслядоўна вырашаць як агульныя задачы музычнага развіцця дзіцяці, фарміравання кампанентаў яго музычнай культуры, так і задачы, спецыфічныя для кожнай тэмы.




*Рыс. 2.* Канцэптуальная мадэль фарміравання музычнай культуры старэйшага дашкольніка сродкамі нацыянальнага фальклору

Гэта могуць быць наступныя тэмы: “Уводзіны ў фальклор”, “Кірмаш”, “Калыханкі”, “Зімовы фальклор”, “Заняткі нашых продкаў”, “Беларускія музычныя інструменты”, “Веснавы фальклор”, у кожную з якіх уваходзіць 4–6 заняткаў, аб’яднаных пэўнымі сюжэтамі і гульнёвымі сітуацыямі, створанымі з дапамогай лялек або батлеечных персанажаў. Прапанаваная паслядоў-

насць тэм дазваляе карыстацца матэрыялам на працягу навучальнага года (“Уводзіны ў фальклор” – верасень-кастрычнік, “Кірмаш” – кастрычнік-лістапад, “Калыханкі” – лістапад-снежань, “Зімовы фальклор” – снежань-студзень, “Заняткі нашых продкаў” – студзень-люты, “Музычныя інструменты” – люты-сакавік, “Веснавы фальклор” – сакавік-красавік).

Акрамя таго, ад тэмы да тэмы пажадана (па магчымасці) ускладняць (напрыклад, у ладавых адносінах) музычны матэрыял, выканальніцкія і творчыя заданні для дзяцей, пашыраць іх веды аб жанрах і музычных інструментах. Так, напрыклад, пры вывучэнні тэмы *“Уводзіны ў фальклор”* музычны фальклорны матэрыял цесна звязаны з практыкай моўных інтанацый, гукаперайманнямі – дзеці знаёмяцца з жанрамі, якія іх найбольш выразна адлюстроўваюць (былічка, прычыт, пастухоў найгрыш і інш.). Прадстаўлены таксама творы, пабудаваныя ў найбольш вузкіх ладах – тэрцыевых, уключаючы і тэрцыевы лад з субквартай. У межах гэтых ладоў дзеці выконваюць заданні, звязаныя са спевамі і музіцыраваннем, з найбольш даступнымі ім творчымі праявамі, якія носяць сінкрэтычны характар (заданні па агучванні былічкі і казкі). Падчас выканання музычна-рытмічных рухаў дашкольнікі замацоўваюць свае ўяўленні аб танцавальных жанрах полькі і кадрылі, гучанні скрыпкі.

Ужо пры вывучэнні тэмы *“Кірмаш”* акрамя тэрцыевых ладоў ад выхавальнікаў патрабуецца выкананне тэтрахордаў, у рэпертуары з’яўляецца пентатоніка (“Ішоў Бай”) і лад з цэнтральнай тонікай і ладавай рамкай “малая сэпціма” (“Гойда, гойда, гайдамаш”). Вялікая ўвага надаецца жанру забаўлянкі, асаблівасцям іх рытмічнай будовы і выкладання тэксту, выкананню на аснове гэтых твораў музычна-творчых заданняў. Сярод прапанаваных у тэме танцаў трэба вылучыць “Лявоніху”, “Юрачку”, “Мосцік”, музычных інструментаў – скрыпку, цымбалы, дудку, гармонік, ліру.

Тэма *“Калыханкі”* дае магчымасць у працэсе спеваў, музіцыравання і вакальнай імправізацыі (ёй надаецца асаблівая ўвага) замацоўваць уяўленні аб тэрцыевых ладах (менавіта ў гэтым жанры тэрцыевы лад з субквартай прадстаўлены ў амаль што

схематычным выглядзе), мажорным і мінорным нахіленні ў іх (на прыкладзе варыянтаў з розным ладавым нахіленнем), фарміраваць навыкі інтанавання ў квартавых ладах і пентатоніцы, знаёміць з раўнамерным і пункцірным рытмічнымі малюнкамі. Праз супрацьпастаўленне двух узораў – калыханкі і забаўлянкі з падобнымі вобразамі – замацоўваюцца ўяўленні дзяцей аб характары і функцыянальных асаблівасцях гэтых жанраў.

## Заняткі "Зімовы фальклор"

Заняткі на зімовую тэму прызваны пазнаёміць дзяцей з каляндарна-абрадавым фальклорам, некаторымі традыцыямі праводзення зімовых свят беларусаў. Праз заняткі вырашаюцца і задачы музычнага развіцця дзяцей. У працэсе спеваў, музіцыравання на шумавых інструментах, рухаў яны знаёмяцца з тыповымі рытмічнымі малюнкамі калядак і шчадровак (праз параўнанне варыянтаў твораў), з такой рытмічнай і меладычнай асаблівасцю, як рэфрэн ("Гэй, каляда!", "Добры вечар!"). У гукавысотных адносінах з'яўляецца інтэрвал чыстай квінты, які інтаніруецца дзецьмі. Прысутнасць ужо знаёмых дзецям ладоў (секундавы і тэрцыевы, тэрцыевы з субквартай, лад з цэнтральнай тонікай) дапамагае замацаваць уяўленні аб ладавых адносінах, ствараць уласныя варыянты шчадровак. Пашыраюцца і веды аб жанрах: акрамя спецыфічна фальклорных калядак і шчадровак адбываецца знаёмства з танцам "Жораў" (танцавальная лексіка падобна да "Мосціка"), калядным танцам-гульнёй "Пакажы, казелінька" і музычнымі інструментамі (парныя дудкі).

## Заняткі на іншыя тэмы

У сувязі з наяўнасцю шматлікіх фальклорных твораў, тэматыка якіх звязана з заняткамі земляроба і рамесніка, прыладамі працы, прапануецца тэма *«Заняткі нашых продкаў»*. Большую частку музычнага рэпертуару ў гэтай тэме складае танцавальная музыка, якая дазваляе дзецям праявіць свае творчыя здоль-

насці падчас стварэння рухавых імправізацый-імітацый, пачуццё рытму падчас музіцыравання на дзіцячых інструментах, фарміраваць навыкі выразных і дакладных рухаў (“Шастак”, “Таўкачыкі”, “Млынок”, “Каваль”). Пры вывучэнні гэтай тэмы дзеці знаёмяцца з познетрадыцыйным песенным узорам “Я табун сцерагу”, які У. Ялатаў называў сапраўдным шэдэўрам песеннага фальклору. Прысутнічае і жанр забаўлянкі, на аснове якога ў працэсе самастойнага дзіцячага выканання на ксілафоне замацоўваецца тэрцыевы лад з субквартай (“Сіўка-варонка”), удакладняюцца ўяўленні дзяцей аб мажорных і мінорных ладах (імправізацыя на тэкст забаўлянкі “Коў-коў, кавалёк”).

Тэма *“Беларускія музычныя інструменты”* дазваляе абагуліць і пашырыць веды аб традыцыйных інструментах (скрыпка, цымбалы, дудка, парныя дудкі, пішчык, дуда, гармонік, балалайка) і аб музыцы і рухах да танцаў, якія гучаць у выкананні гэтых інструментаў (“Лявоніха”, “Юрачка”, “Мікіта”, “Крыжачок”, “Старажытны палескі вальс”). Ажыццяўляецца гэта падчас успрымання музычна-рытмічных рухаў, музіцыравання, падпявання (песні “Іграў я на дудцы”, “Зайграй жа мне, дударочку”). Пры выкананні на ксілафоне імён танцораў (Лявоніха, Мікіта, Юрачка) дзеці практыкуюцца ў інтанаванні і ігры на інструменце мажорнага трохгучча і малой сэксты.

Тэма *“Веснавы фальклор”* зноў звяртаецца да абрадавага боку фальклору. У музычным матэрыяле тэмы прадстаўлены пентатоніка (“Жаваронachкі, прыляціце”), квінтовы лад (“Дазвольце, людзі”) і лад з ніжняй тонікай і ладавай рамкай “малая сэпціма” (“Свяці, свяці, сонейка”), які засвойваецца ў спевах і выкананні на ксілафоне ладавай рамкі – інтэрвалу малой сэпцімы. У рытмічных адносінах гэты матэрыял таксама дастаткова складаны – прысутнічаюць распевы гукаў. У іншых тэмах дашкольнікі не сустракаліся і з традыцыйным для веснавога цыклу карагодам “крывым танком”, і жанрам заклічкі, на матэрыяле якой выконваюцца музычна-творчыя заданні.

Знаёміць дашкольнікаў з фальклорным матэрыялам можна ў самых разнастайных формах арганізацыі музычнага выхавання ў дашкольнай установе. Шырокія магчымасці ён мае пры пад-

рыхтоўцы розных відаў музычных заняткаў: тэматычных, комплексных, тыповых. Музычны кіраўнік можа арганізаваць і правядзенне забаў (1–2 разы на месяц), для якіх падыйдзе матэрыял тэм "Кірмаш", "Зімовы фальклор", "Заняткі нашых продкаў", "Веснавы фальклор". Дадзены матэрыял можа быць паспяхова выкарыстаны і пры падрыхтоўцы фальклорных святаў (матэрыял тэм "Зімовы фальклор", "Веснавы фальклор"). Але найбольш эфектыўнай формай можа стаць спецыяльна арганізаваны цыкл заняткаў (1 раз на тыдзень, магчыма ў другой палове дня) або музычны гурток, менавіта для такіх форм, у якіх у поўнай меры рэалізуецца паслядоўнае і сістэматызаванае, усебаковае вывучэнне ўсяго матэрыялу. Але прапанаванае планаванне музычнай дзейнасці дзяцей на занятках, гульнёвыя сітуацыі і сюжэтны бок з'яўляюцца прыкладнымі і ні ў якім разе не прэтэндуюць на аксіёму. Колькасць часу на развучванне некаторых твораў (для далейшага выканання "на сцэне") можа быць павялічана, частка прапанаванага матэрыялу з поспехам можа быць заменена на іншы ў тым выпадку, калі пры гэтым не парушаюцца агульныя падыходы да адбору музычнага матэрыялу і арганізацыі працы з ім.

У якасці прыкладу прапануем метадычную распрацоўку па тэме "*Калыханкі*". Выдзяленне дадзенай тэмы абумоўлена значнасцю гэтага жанру ў сістэме жанраў беларускага музычнага фальклору, блізкасці тэматыкі калыханак дашкольнікам, разнастайнасцю і ў той жа час тыповасцю напеваў калыханак як яскравых узораў нацыянальнай музычнай спадчыны. Метадычная распрацоўка ўключае ў сябе прыкладнае планаванне заняткаў па гэтай тэме (у гуртковай працы, серыі тэматычных заняткаў, музычных забаў) з характарыстыкай рэкамендаванага фальклорнага матэрыялу з пункту гледжання яго ладавых і рытмічных асаблівасцей і ўказаннем непасрэдных задач фарміравання кампанентаў музычна-эстэтычнай культуры дашкольніка на дадзеным рэпертуары (прыведзена ў табліцах), а таксама неабходны літаратурны, музычны матэрыял і магчымы ход заняткаў па тэме.

У больш поўным аб'ёме з метадычным, музычным і літаратурным матэрылам па ўсіх тэмах, прапанаваных у тэхналогіі, можна азнаёміцца ў дапаможніку аўтара "Музычная скарбонка".

## ПРЫКЛАДНАЕ ПЛАНАВАННЕ ЗАНЯТКАЎ ПА ТЭМЕ "КАЛЫХАНКІ"

| Нумар занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці | Задачы выкарыстання фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 1 | Успрыманне літаратурнага твора | Казка "Пілiпка-сынок". У казцы тэкст калыханкі: "Люлі, люлі, сынок, з белымі плячыцамі, з чорнымі вачыцамі...", моўны выраз: "калыхаць і ката спяваць" | Выкліканне цікавасці да жанру калыханкі праз знаёмыя літаратурныя вобразы |
| | Успрыманне музыкі | Калыханка "Спі, сыночак міленькі" (№1). Уступ калыханкі – тыповы ўзор характэрнага для калыханак глісандуючага інтанавання на гук [*а*]. У першай частцы – жанрава характэрны тэрцыевы лад з субквартай (мінорнае нахіленне) | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага пачуцця; узбагачэнне слоўніка дзяцей параўнаннямі і эпітэтамі |
| | Вакальная імправізацыя | Тэкст для імправізацыі: "А-а-а", лічылка № 1. У імправізацыі неабходна адлюстраваць пэўны настрой і выкарыстаць адпаведны тып інтанавання ў розных рэгістрах. Дарослы можа выканаць у якасці прыкладу ўзор № 1а | Замацаванне ўяўленняў аб музычных рэгістрах у працэсе ўласных спеваў; развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, выразнасці выканання, прадуктыўнага музычнага мыслення |
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка "Хадзіў каток па капусце" (№2). Калыханка цалкам вытрымана ў тэрцыевым ладзе з субквартай (мажорнае нахіленне). У рытмічных адносінах – узор раўнамернага рытму | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага пачуцця; фарміраванне ўяўленняў аб раўнамернай паслядоўнасці даўжынь гукаў у працэсе выканання твора |

*Працяг табліцы*

| Нумар занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці | Задачы выкарыстання фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка “А ты, каток шэры” (№3). У першай частцы калыханкі – тэрцыевы лад з субквартай (мінорнае нахіленне). У рытмічных адносінах – наяўнасць трыолей, чаргавання кароткіх і доўгіх гукаў у характэрнай для калыханак паслядоўнасці | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага пачуцця; фарміраванне ўяўленняў аб выразным значэнні чаргавання кароткіх і доўгіх гукаў у працэсе ўзнаўлення твора і маторнага ўпадаблення гучанню |
| | Рухавая гульня | Гульня “У ката”, лічылка № 2 | Развіццё ладавага пачуцця |
| 2 | Спевы | Калыханкі “Хадзіў каток па капусце”, “А ты, каток шэры”, лічылка № 1 | Замацаванне ўяўленняў аб мажорным і мінорным гучанні тэрцыевага ладу з субквартай у працэсе выканання твораў; фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання тэрцыевых і квартавых інтанацый |
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка “Люлі, люлі, люлі, спаць” (№ 4) з двума варыянтамі тэкстаў. Калыханка выконваецца на двух гуках у інтэрвале малой тэрцыі, рытмічны малюнак – чаргаванне кароткіх і доўгіх гукаў у характэрнай для калыханак паслядоўнасці | Асэнсаванне наяўнасці тэкставых варыянтаў твора, фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання інтэрвалу малой тэрцыі; развіццё меладычнага слыху і музычна-рытмічнага пачуцця |
| | Музіцыраванне і спевы | Калыханка “Люлі, люлі, люлі, спаць”, металафон, трохвугольнік | Развіццё меладычнага слыху і музычна-рытмічнага пачуцця |
| | Рухавая гульня | Гульня “У ката”, лічылка № 2 | Развіццё ладавага пачуцця |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Успрыманне музыкі | Калыханка "Пайшоў каток..." (№5). Ладавая асаблівасць твора – наяўнасць пентатонікі | Развіццё ладавага пачуцця, пачуцця гумару |
| | Імправізацыя тэксту калыханкі | Калыханка "Пайшоў каток...", прыклады варыянтаў тэксту (№ 5а). У ствараемых тэкстах неабходна прытрымлівацца схемы: "Пайшоў – прынёс (знайшоў)" | Развіццё творчага мыслення, ініцыятыўнасці і актыўнасці |
| 3 | Спевы з элементамі інсцэніроўкі | Калыханка "Пайшоў каток..." | Развіццё меладычнага слыху ў працэсе ўзнаўлення твору, навыкаў выразнага адлюстравання дзеянняў вобраза ў рухах |
| | Вакальная імправізацыя, стварэнне калектыўных варыянтаў | Тэкставыя варыянты па схеме "Пайшоў – прынёс (знайшоў)". Варыянты тэкстаў калектыўна выконваюцца ў тэрцыевым ладзе з субквартай (з мажорным або мінорным нахіленнем). Узорамі могуць быць прыклады – ладавыя схемы № 5б і № 5в | Развіццё прадуктыўнага музычнага мыслення, замацаванне ўяўленняў аб тэрцыевым ладзе з субквартай, аб яго эмацыянальных адценнях |
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка "Ходзіць певень па капусце" (№6). Калыханка вытрымана ў тэрцыевым ладзе з субквартай (мінорнае нахіленне). У рытмічных адносінах – чаргаванне кароткіх і доўгіх гукаў у характэрнай паслядоўнасці | Асэнсаванне варыянтнасці фальклорных твораў праз параўнанне твора з іншымі прыкладамі |
| | Спевы | Калыханкі № 2, 3, 6 | Асэнсаванне варыянтнасці фальклорных твораў праз іх параўнанне; замацаванне вывучаных твораў |
| | Рухавая гульня | Гульня "Лавіць куры", лічылка № 3 | Развіццё ладавага пачуцця |
| 4 | Спевы | Калыханка "Ходзіць певень па капусце" | Замацаванне вывучанага твора; развіццё гукавысотнага слыху, музычна-рытмічнага і ладавага пачуцця |

*Заканчэнне табліцы*

| Нумар занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці | Задачы выкарыстання фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 4 | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка "Люлі, люлі, люлі, прыляцелі куры" (№ 7). Твор вытрыманы ў квартавым ладзе, мелодыя будуецца на спалучэнні малой тэрцыі з вялікай секундай. Рытмічны малюнак: спалучэнне кароткіх і доўгіх гукаў; рытмічны малюнак з трыюлямі, жанрава характэрны тэкст і вобразы | Фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання, развіццё музычна-рытмічнага пачуцця, пашырэнне ведаў аб вобразах калыханак |
| | Рухавая гульня | Гульня "Лавіць куры", лічылка № 3 | Развіццё ладавага пачуцця |
| | Успрыманне музыкі | Забаўлянка "Ладкі, ладушкі, прыляцелі птушкі" (№ 8). Твор вытрыманы ў квартавым ладзе, меладычная лінія будуецца на спалучэнні вялікай секунды і малой тэрцыі | Замацаванне ведаў пра асаблівасці жанраў калыханкі і забаўлянкі праз параўнанне падобных па вобразным змесце твораў |
| | Спевы і музіцыраванне | Калыханка "Пайшоў каток...", музычныя інструменты | Усведамленне выразных магчымасцяў тэмбраў дзіцячых музычных інструментаў праз аркестроўку твора |
| | Спевы, імправізацыя і музіцыраванне | Увесь вывучаны па тэме матэрыял | Замацаванне ўяўленняў аб жанры калыханкі, вобразах знаёмых калыханак, іх ладавых і рытмічных асаблівасцях |
| | Успрыманне музыкі | Інструментальная калыханка па выбары педагога. Магчыма выкарыстоўваць як апрацоўкі фальклору, так і аўтарскія творы | Усведамленне сувязі паміж вакальнай і інструментальнай музыкай; асэнсаванне песеннасці ў інструментальнай музыцы |
| | Вакальная імправізацыя | Тэкст калыханкі з казкі "Пілiпка-сынок", у які ўносяцца дапаўненні і змяненні. Магчымы варыянт тэксту: "Люлі, люлі. Спі, Піліпка-сынок, спі, мой мілы галубок, з белымі плячыцамі, з чорнымі вачыцамі. А-а-а, а-а-а" | Развіццё прадуктыўнага музычнага мыслення; замацаванне ведаў аб жанры калыханкі |

## Абсталяванне, фальклорны матэрыял і прыкладны лад занятка

*Абсталяванне*: персанажы батлеечнага тэатра або цацкі: хатка, людзі (дзед і баба, маці і бацька, дзіця ў калысцы), жывёлы (кот, петух і куры); дзіцячыя музычныя інструменты: металафон або ксілафон, званочак, трохвугольнік і інш.

### *Літаратурны фальклорны матэрыял*

*Казка* "Пілiпка-сынок" [17]

*Лічылкі*:

№ 1

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсць, сем, восем,
Выйшла баба з доўгім носам,
А за бабай сівы дзед,
Колькі дзеду таму лет?

№ 2

Ішоў кот праз сто варот,
Дайшоў да канца,
Знайшоў кацяня.
– Мяў!

№ 3

Пайшла курка ў аптэку,
Закрычала: "Кукарэку!
Дайце пудры і духоў
На падманку петухоў".

## *Музычны фальклорны матэрыял*

*Натаваныя творы:*

№ 1 [4, с. 21]

Калыханка




А... а... люлі, а... а... люлі.
Спі, сыночак міленькі,
Галубочак сізенькі.
Мой сыночак будзе спаць,
А я буду калыхаць.

Нашто, вецер, ты гудзеш,
Спаць Міхаську не даеш?
Спі, сыночку міленькі,
Ой, да люлі, люленькі...

*Варыянт тэксту* [2, с. 130]:

Спі, дачушка мілая,
Нашто, вецер, ты гудзеш,
Галубачка сізая.
Спаць Марысі не даеш?

Мая дочка будзе спаць,
Спі, дачушка мілая,
А я буду калыхаць.
А я цябе люляю.

№ 1а [2, с. 131]

Калыханка



№ 2 [4, с. 18; 9, № 15]

### Калыханка




№ 3 [9, № 29]

### Калыханка




№ 4 [16, с. 10]

### Калыханка




*Варыянт тэксту* [9, с. 98]:

Люлі, люлі, люляю.
Засні, спаці, гультаю.

№ 5 [9, № 136; 4, с. 20; 2, с. 134]

### Калыханка




Пайшоў каток у лясок[1]
Шукаць Волі паясок.
Ён паяска не знайшоў.
Узяў плюнуў і пайшоў.
А Волечка чакае,
Што ёй каток шукае.
Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.
Ён сам бярэ і жарэ,
А Волечцы не дае.

№ 5а [16, с. 28]

Пайшоў каток у лясок, прынёс каток паясок.
Пайшоў каток на ганачак, прынёс каток бараначак.
Пайшоў каток у лавачку, прынёс каток булавачку.
Пайшоў каток на рыначак, прынёс каток разыначак.
Пайшоў каток на крылечка, прынёс каток калечка.
Пайшоў каток на таржок, прынёс каток піражок.

[1] Кожны радок паўтараецца двойчы.

№ 5б.



№ 5в.



№ 6 [4, с. 18]

## Калыханка




№ 7 [9, № 195]

## Калыханка




№ 8 [4, с. 29]

## Забаўлянка



*Увага*! У тэкстах прыведзеных калыханак неаднаразова выкарыстаны розныя імёны дзяцей, для якіх калыханка выконваецца. Пры арганізацыі заняткаў па тэме гэтыя імёны неабходна змяняць на тыя, якіх патрабуе сюжэтная лінія заняткаў (у дадзеным прыкладзе – на імя Міхась).

## Магчымая сюжэтная лінія і гульнёвыя сітуацыі

**Занятак 1**. Персанаж батлеечнага тэатра – дзядуля прапануе дзецям успомніць казку "Пілінка-сынок" (або абяцае пазнаёміць з гэтай казкай). Пасля чытання ўрыўку ад пачатку казкі дзед пытаецца ў слухачоў, ці запомнілі яны, якія словы спявала маці над калыскай, і ўдакладняе, ці ведаюць дзеці, як называюцца песні, якія спяваюць, каб дзеткі спалі. Далейшае чытанне казкі дзядуля прапануе адкласці і пазнаёміцца з жыхарамі яго хаткі (дэманструе персанажы – бабулю, маладых маці і бацьку, дзіця), а потым усім разам скласці пра іх сваё апавяданне.

Пачатак апавядання можа быць наступны: "У вёсцы заўсёды шмат працы. Вось і сёння зранку малады гаспадар ужо пайшоў у поле, а маладая гаспадыня толькі сабралася пайсці з дому, як яе малое дзіця прачнулася і пачало плакаць. Што рабіць? Трэба заспяваць калыханку, каб дзіця супакоілася і заснула". Пасля гэтага ў выкананні дарослага гучыць калыханка "Спі, сыночак міленькі" (№ 1). (*Увага*! Магчыма выкананне варыянту гэтай калыханкі для дзяўчынкі "Спі, дачушка мілая"). Пасля праслухоўвання пажадана звярнуць увагу дзяцей на словы, з якімі маці звяртаецца да свайго сыночка Міхаські, ахарактарызаваць пачуцці, адлюстраваныя ў творы.

Далей дарослы распавядае: "Міхаська як быццам заснуў, але толькі маці пайшла з дому, ён зноў заплакаў. Дзядуля і бабуля пачалі супакойваць малога. Але адразу не ўспомнілі якую-небудзь калыханку, а таму заспявалі, як змаглі". Пасля гэтага дарослы выконвае варыянт калыханкі на гукі "А-а-а" (№ 1а) у розных галасавых рэгістрах ад імя бабулі або дзядулі. Затым дзецям прапануецца таксама выканаць падобную калыханку. Спа-

чатку дзяўчынкі па жаданні імправізуюць ад імя бабулі, а хлопчыкі – ад імя дзядулі, а потым удзельнічаюць усе дзеці, усталёўваючы чаргу па лічылцы № 1.

Пасля выканання гэтага задання дзядуля раптам «узгадвае» калыханку і "выконвае" яе (№ 2 "Хадзіў каток па капусце"), далей калыханка развучваецца з дзецьмі "з голасу", пры гэтым спевы можна суправаджаць імітацыяй рухаў персанажа (катка), мадэліруючых рытмічны малюнак. Неабходна абавязкова звярнуць увагу дзяцей і на настрой калыханкі (мажорны лад).

Далей дарослы працягвае: "Дзядуля разам з намі шмат разоў пеў калыханку. Ён нават стаміўся, таму бабуля вырашыла паклікаць ката, каб ён дапамог ім". Пасля гэтага дарослы ад імя бабулі выконвае першыя два радкі калыханкі № 3 "А ты, каток шэры". Дзецям прапануецца паклікаць ката разам (пры выкананні неабходна звярнуць увагу на мінорны лад твора). Такім чынам першая частка калыханкі можа спявацца (калектыўна або сола) да таго моманту, пакуль іх выкананне "не задаволіць" ката. Да той пары «кот» (дарослы) кожны раз прапявае трэці радок калыханкі. Калі калыханка ў выкананні дзяцей гучыць здавальняюча, дарослы ад імя бабулі дапявае апошні радок. Напрыканцы ўвесь твор выконваецца калектыўна яшчэ раз. Маленькі Міхаська "засынае", а кот прапануе дзецям рухомую гульню «У ката». Для арганізацыі гульні выкарыстоўваецца лічылка № 2.

**Занятак 2**. Напачатку дзецям прапануецца ўзгадаць, якія калыханкі пелі дзед і баба, і разам з імі выканаць іх для маленькага Міхася. Яшчэ раз удакладняецца ладавая афарбоўка двух твораў: дзядуліна калыханка больш бадзёрая, яна гучыць весялей; бабуліна – больш спакойная і сумная.

Калі кот зноў з'яўляецца, яго просяць спець новую калыханку. Дарослы ад імя ката выконвае калыханку № 4 "Люлі, люлі, люлі, спаць" з першым варыянтам тэксту, дзе звяртаюцца да Светачкі, на што кату робяць заўвагу. Тады "кот" спявае гэтую калыханку з другім варыянтам тэксту. Пры далейшых калектыўных спевах гэтага варыянту дзецям прапануецца суправаджаць

спевы рухамі правай рукі, імітуючы рух калыскі і мадэліруючы метрычную аснову твора.

Далей гэты варыянт калыханкі выконваецца дарослым на металафоне або ксілафоне, некалькі дзяцей па чарзе (па жаданні або па лічылцы) адзначаюць метрычную пульсацыю мелодыі на трохвугольніку. Пасля гэтага дзеці па жаданні могуць самі сыграць мелодыю на гукавысотным інструменце (сола або нават дуэтамі).

Пасля правядзення рухавай гульні "У ката" дзеці знаёмяцца з новым узорам калыханкі, што выконвае маці, якая ўжо прыйшла дадому (№ 5 "Пайшоў каток..."). Яна просіць ката прынесці падарункі для Міхаські. Пасля ўспрымання і, па магчымасці, падпявання дзецьмі асобных фраз твора дзецям прапануецца самім скласці варыянты тэксту, адказваючы на пытанні: *куды мог яшчэ пайсці каток*? *што ён мог прынесці ў падарунак*? Каб палегчыць дзецям задачу, дарослы можа прапанаваць свой варыянт адказу на першае пытанне (можна карыстацца варыянтам № 5а), а дзеці ў рыфму падбіраюць адказ на другое пытанне.

**Занятак 3**. Падарожжа катка за падарункамі працягваецца, але яму патрабуецца дапамога дзяцей. У гэты момант яны самі становяцца "катамі" і разнастайнымі рухамі адлюстроўваюць падзеі, якія адбываюцца ў творы. Пасля некалькіх выкананняў твора выяўляецца "лепшы кот". Яму дазваляецца прапанаваць свой тэкст пра падарунак ад ката (або ўзгадаць з папярэдняга занятку) і вызначыць, які настрой будзе адлюстраваны ў гэтай калыханцы (мажорнае або мінoранае нахіленне). Пасля гэтага калектыўна выконваецца прапанаваны варыянт з апорай на гукі тэрцыевага ладу з субквартай (прыклады № 5б і 5в). Пажадана адабраць і выканаць калектыўна некалькі варыянтаў.

Далей дарослы працягвае сюжэтную лінію: "Сваю калыханку вырашыў праспяваць сыночку і яго бацька. Вось што ў яго атрымалася..." (дарослы ад імя бацькі выконвае калыханку № 6 "Ходзіць певень па капусце"). Пасля ўспрымання абавязкова трэба параўнаць гэты твор з ужо вядомымі дзецям калыханкамі. Ён можа запытацца: "Хто з нашых жыхароў хаткі спяваў падобную калыханку?" Хутчэй за ўсё дзеці ўстановяць падобнасць новай калыханкі да дзе-

давай калыханкі “Хадзіў каток па капусце” (падобны па тэксту і сюжэту, але адрозніваюцца ладам). Неабходна звярнуць увагу на меладычную падобнасць з калыханкамі, якія спявалі маці (“Спі, сыночак міленькі”) і бабуля (“А ты, каток шэры”). Пажадана яшчэ раз разам з дзецьмі выканаць гэтыя калыханкі.

Напрыканцы занятку можна правесці рухомую гульню “Лавіць куры”, выкарыстоўваючы лічылку № 3.

**Занятак 4.** Напачатку дзеці разам з дарослым узнаўляюць калыханку “Ходзіць певень па капусце”. У мэтах найлепшага засваення рытмічнага малюнка і мелодыі карысна выкарыстоўваць рухавае мадэліраванне, звязанае з вобразам: рытмічны малюнак адлюстроўваць падчас выканання з дапамогай “шагоў пеўня”, а гукавысотную лінію – “крылаў пеўня” (рухаў рукамі).

Працягваючы сюжэтную лінію заняткаў, дарослы прапануе паклікаць кур. Дзеля гатага можна ўзгадаць лічылку № 3 і нават паспрабаваць некалькі разоў яе меладызаваць па ролях, дзе дарослы будзе спяваць словы аўтара, а дзеці па жаданні – словы куркі. Пасля гэтага дарослы знаёміць дзяцей з новай калыханкай “Люлі, люлі, люлі, прыляцелі куры” (№ 7). Пры паўторным выкананні дзеці павінны падпяваць даросламу, суправаджаючы спевы рухамі пад тэкст твора.

Пасля рухомай гульні “Лавіць куры” дарослы паведамляе, што “наш маленькі Міхаська сёння ўжо добра паспаў і яго патрэбна павесяліць, пазабавіць. Вось як мы яму праспяваем...” Пасля гэтага выконваецца забаўлянка “Ладкі, ладушкі” (№ 8), тэкст якой нагадвае тэкст апошняй з калыханак, выяўляецца роднасць вобразаў твораў, але падкрэсліваецца іх рознае функцыянальнае значэнне і настрой. Падчас выканання забаўлянкі дзеці могуць выконваць характэрныя для яе пляскання ў далоні, ствараючы некаторыя варыянты рытмічнага малюнка твора.

Пасля ўдакладнення жанравай прыналежнасці твора дарослы прапануе ўзгадаць вядомыя дзецям забаўлянкі, выканаць іх калектыўна, у ансамблях або сола.

Напрыканцы зноў можна звярнуцца да жанру калыханкі праз пытанне: “А ў калыханках бывае смешны тэкст, як у забаўлян-

ках?" Твор "Пайшоў каток ў лясок" выконваецца і аркеструецца дзецьмі з дапамогай дзіцячых інструментаў, якія імітуюць шум лесу, плёск вады.

**Занятак 5** прысвечаны галоўным чынам замацаванню вывучаных твораў, удакладненню ўяўленняў пра іх асаблівасці. Паўтарэнне калыханак магчыма ажыццявіць праз выпадковы выбар вобраза калыханкі або персанажа, які выконваў калыханку. Так, можна арганізаваць гульню накшталт "Цудоўнага меху", дзе схаваліся персанажы, якія ўдзельнічалі ў занятках тэмы, або з дапамогай "ваўчка", які пакажа на знаёмы персанаж, або кубіка, на гранях якога адлюстраваны вобразы і сюжэты калыханак. Пры жаданні дзеці могуць узнаўляць свае імправізацыі або ствараць новыя варыянты, музіцыраваць. Цікаўнасць выклікае ў дзяцей прапанова выканаць калыханку для каго-небудзь з групы або для любімай цацкі з абавязковым зваротам па імені.

У мэтах пашырэння ўяўленняў дзяцей аб жанры карысным будзе прапанаваць для ўспрымання інструментальную калыханку (запіс або жывое выкананне). Неабходна звярнуць увагу дзяцей на песеннасць у інструментальнай музыцы: "У гэтай калыханцы няма слоў, але па настрою меладычнасці музыкі мы можам здагадацца, што гэта калыханка". Пры жаданні дзеці на гукі "А-а-а" могуць падпяваць інструментальнаму выкананню.

У канцы вывучэння тэмы "Калыханкі" пажадана зноў звярнуцца да тэксту казкі "Пілiпка-сынок" і меладызаваць новы тэкст калыханкі для Піліпкі, у які можна ўключыць такія характэрныя для жанру словы, як "а-а", "люлі", разнастайныя звароты.

# ВЫНІКОВАСЦЬ ТЭХНАЛОГІІ

Асэнсаванне магчымасцей музычнага фальклору ў фарміраванні кампанентаў музычна-эстэтычнай культуры асобы дазваляе разглядаць фальклор не толькі як сродак фарміравання першапачатковых уяўленняў аб нацыянальнай культуры ўвогуле, але і як эфектыўны і дастаткова універсальны сродак развіцця музыкальнасці і музычна-эстэтычнай свядомасці дашкольнікаў, у выніку чаго магчыма пашырэнне выкарыстання фальклору ў практыцы музычнага выхавання ў дашкольнай установе. Прапанаваная тэхналогія, распрацаваная з улікам як асаблівасцей фальклорнага мастацтва (яго вуснасці, варыянтнасці і варыятыўнасці, сінкрэтычнасці, наяўнасці тыповых інтанацый) і музычных асаблівасцей (ладавых, рытмічных), ствараючых нацыянальна-спецыфічны каларыт беларускага музычнага фальклору, дазволіць ажыццяўляць азнаямленне з фальклорам і вывучэнне дадзенага музычнага матэрыялу з дзецьмі старэйшага дашкольнага ўзросту з дасягненнем большага развіццёвага эфекту, чым у выпадку нямэтанакіраванага бессістэмнага выкарыстання асобных твораў.

# ЛІТАРАТУРА


1. *Алексеев, Э. Е.* Раннефольклорное интонирование. М.,1986.

2. Анталогія беларускай народнай песні / Уклад. Г. Цітовіч. Мн., 1975.

3. *Анцыпыровіч, В. М.* Музычная скарбонка. Мазыр, 2007.

4. Беларускі дзіцячы фальклор / Скл.: А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў, А. С. Фядосік, У. Д. Каструлёў. Мн., 1994.

5. Беларускі музычны фальклор / Скл.: А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў, У. Д. Каструлёў. Мн., 1996.

6. Беларускі фальклор у школе : 1 клас : дапаможнік для настаўніка / І. І. Сучкоў, Ф. І. Таранава і інш. Мн., 1996.

7. *Ветлугина, Н. А.* Музыкальное развитие ребенка. М., 1968.

8. *Грыневіч, А.* Дзіцячы спеўнік / А. Грыневіч. Вільня, 1925.

9. Дзіцячы фальклор / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мн., 1972.

10. *Елатов, В. И.* Ладовые основы белорусской народной музыки. Мн., 1964.

11. *Елатов, В. И.* Мелодические основы белорусской народной музыки. Мн., 1970.

12. *Елатов, В. И.* Ритмические основы белорусской народной музыки. Мн., 1966.

13. *Каган, М. С.* Философия культуры. СПб., 1996.

14. Казкі для сцэны / Скл. М. Федасеенка. Мн.,1992.

15. *Калужникова, Т. И.* Возрастные особенности интонирования (на материале современного детского фольклора Свердловской области) // Традиционная культура и мир детства: Материалы междунар. научн. конф. «11 Виноградовские чтения». – Ульяновск, 1998. С. 58–70.

16. Калыханкі і забаўлянкі / Скл. В. Ліцвінка. Мн.,1992.

17. Каток — залаты лабок: Бел. нар. казкі. Мн., 1986.

18. *Кирнарская, Д. К.* Современные представления о музыкальных способностях // Вопросы психологии. – 1988. – № 2. – С. 129—137.

19. Людзей слухай, а свой розум май : беларускія народныя казкі. Мн., 1988.

20. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты. Мн., 1997.

21. *Науменко, Г. М.* Фольклорная азбука. М., 1996.

22. Пралеска : хрэстаматыя для дзіцячага сада і пачатковай школы. Мн., 1997.

23. *Радынова, О. П.* Музыкальные шедевры: авт. программа и метод. рекомендации. М., 1999.

24. *Ройтерштейн, М. И.* Дети и музыка (о значении музыкального материала для формирования музыкального восприятия) // Развитие музыкального слуха, певческого голоса и музыкально-творческих способностей учащихся общеобразовательной школы: Сб. тезисов VI научн. конф. М., 1982. С. 94–96.

25. *Скарабагатчанка, А.* Беларускія народныя музычныя інструменты 20 стагоддзя. Мн., 2001.

26. *Тарасова, К. В.* Онтогенез музыкальных способностей. М., 1988.

27. *Теплов, Б. М.* Психология музыкальных способностей // Избр. труды: в 2 т. М.,1985. Т. 1.

28. Ходзіць жораў па таку / Скл. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1993.

29. *Чурко, Ю. М.* Вянок беларускіх танцаў. Мн., 1994.

Дадатак 1. **Наглядны матэрыял для правядзення дыягнастычнага задання «Тварыкі» – музычная чатырохпавярховая хатка і «тварыкі», якія адпавядаюць чатыром эмацыянальным адценням музыкі**





Картка з выявамі «тварыкаў» разразаецца на восем асобных картак. «Засяліць» хатку неабходна з дапамогай толькі чатырох «тварыкаў». Пры гэтым дзіця да праслухоўвання апошняга музычнага ўрыўка мае магчымасць выбіраць сярод застаўшыхся картак тую, якая, на яго погляд, больш падыходзіць. Музычным матэрыялам могуць быць амаль што любыя рознахарактарныя

творы фальклору. Пры правядзенні задання магчымы варыянты – засяляюць «тварыкі», якія адпавядаюць толькі двум або тром эмацыянальным становішчам. Гэтае заданне можа выкарыстоўвацца не толькі як дыягнастычнае, але і як практыкаванне, у якім дзеці вучацца адрозніваць эмацыянальныя адценні музыкі.

## Дадатак 2. Узоры беларускага дзіцячага фальклору, на аснове якіх выконваецца дыягнастычнае заданне па ўзнаўленню рытмічнага малюнка пляcканнем у далоні

№ 1. Узор раўнамернага рытму:

Ходзіць курачка



№ 2. Узор рытму, у якім спалучаюцца восьмыя і чвэрці, так званы рытм «суміравання». Ён вельмі распаўсюджаны ў фальклорных творах, асабліва дзіцячых. У ім спачатку гучаць кароткія гукі, а потым – доўгія:

Кую, кую ножку



№ 3. Узор рытму, у якім спалучаюцца восьмыя і чвэрці, так званы рытм «драблення», калі пасля больш доўгіх гукаў гучаць кароткія:

Таўкачыкі



№ 4. Узор рытму з «распетым пятым гукам», часцей за ўсё сустракаецца ў творах зімовага цыкла:

Каляда з казой



№ 5. Узор рытмічнага малюнка, у якім больш доўгім з'яўляецца сёмы гук. Такі рытм вельмі часта сустракаецца ў забаўлянках:

Мышка, мышка, дзе была?



№ 6. Узор рытму, у якім спалучаюцца восьмыя і чвэрці, якія змяняюць адна адну. Падобная рытміка назіраецца ў некаторых калыханках.

Калыханка



№ 7. Узор, у якім выкарыстаны “пункцірны” рытм.

Шчодры вечар



# ЗМЕСТ

Уводзіны .......... 3
Асноўныя паняцці тэхналогіі .......... 5
Структура і змест блокаў тэхналогіі .......... 6
Класіфікацыйныя параметры тэхналогіі .......... 7
Мэта і спектр мэтавых арыентацый тэхналогіі .......... 8
Канцэптуальныя палажэнні тэхналогіі .......... 9
Асноўныя педагагічныя сродкі тэхналогіі і іх характарыстыка .......... 13
Характарыстыка дыягнастычнага блока тэхналогіі .......... 20
Асаблівасці методыкі тэхналогіі .......... 33
Прыкладнае планаванне заняткаў па тэме "Калыханкі" .......... 39
Выніковасць тэхналогіі .......... 53
Літаратура .......... 54
Дадаткі .......... 55

Вучэбнае выданне

Современные педагогические технологии
дошкольного образования

**Анцыпіровіч** Вольга Мікалаеўна

# ФАРМІРАВАННЕ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ДАШКОЛЬНІКАЎ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

**Дапаможнік для педагогаў устаноў,
якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі**

Рэдактар *Р. В. Міхнавец*
Дызайн вокладкі *С. У. Баленка*
Камп'ютэрная вёрстка *А. А. Цітовай*

Падпісана да друку 26.06.2007. Фармат 60x84/16. Папера афсетная.
Гарнітура PetersburgC. Афсетны друк. Умоўн.-друк. арк. 3,5.
Ул.-выд. арк. 2,4. Тыраж 2000 экз. Заказ 2328.

Выдавецтва ПУП "Зорны верасень". ЛИ № 02330/0131619 ад 29.06.2004 г.
220040, г. Мінск, вул. Някрасава, 20.
Тэл. 296-66-17, 292-09-86. E-mail: zornyverasen@yandex.ru

Надрукавана ў ААТ "Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня".
ЛП 02330/0131659 ад 02.02.2006 г.
225409, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80. Тэл (0163) 42-53-27.



**Анцыпіровіч Вольга Мікалаеўна,** старшы выкладчык кафедры методык дашкольнага выхавання Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. Скончыла БДПУ імя М. Танка, магістратуру і аспірантуру.

Сфера навуковых інтарэсаў: пытанні музычнага выхавання і развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту. Аўтар многіх навуковых артыкулаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў.

ISBN 978-985-6775-67-6

9 789856 775676